Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 КАСТРЫЧНІКА 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 194
(26059)
Кошт 380 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.


Карэспандэнт выехаў на месца

## Каля брацкай магілы не будзе катэджаў

**У рэдакцыю звярнулася магіляўчанка Няўмоева Ала Фёдараўна. У вялікім лісце жанчына расказала аб праблеме, якая хвалюе жыхароў раёна аўтазавода імя Кірава. Размова ідзе пра будаўніцтва катэджаў.**

Ала Фёдараўна пачала гісторыю з расповеда пра даваенную забудову гэтага магілёўскага раёна і падзей Вялікай Айчыннай вайны. У раёне вуліцы Аўтазаводскай шлі жорсткія баі, а потым знаходзіўся ваенны шпіталь.

Цяпер у гэтым раёне ёсць брацкая магіла воінаў-вызваляльнікаў. Да помніка двойчы на год — 9 мая і 23 лютага — калектыў аўтазавода (цяпер гэта філіял Беларускага аўтамабільнага завода) ускладае вянкі і кветкі. Яшчэ далей, у лясной зоне, знаходзяцца нямецкія вайсковыя могілкі, дзе пахаваны ваеннапалонныя, якія памерлі ў шпіталі. Дарэчы, бачна, што і брацкая магіла, і могілкі даглядаюцца і трымаюцца ў парадку.

«Воіны-вызваляльнікі нашай Айчыны стаялі насмерць і ў голадзе, і ў холадзе, паклалі свае галовы на Алтар Перамогі і не думалі пра ўласныя жыцці, — усхвалявана піша жанчына. — Цаною сваіх жыццяў, крывёю і потам, пакутамі дасталася Перамога нашаму народу, нашай Радзіме.(...) І нямецкія грамадзяне цяпер прыязджаюць, каб ушанаваць памяць сваіх продкаў, якія загінулі на чужой зямлі. Яны не вінаватыя: выконвалі загады сваіх галоўнакамандуючых і не ведалі, дзе давядзецца памерці. (...) І што вы думаеце, на прасякнутай потам і крывёю зямлі побач з брацкай магілай савецкіх воінаў-вызваляльнікаў вырашылі будаваць катэджы!»

Калі пра такія планы даведаліся жыхары навакольных дамоў, яны сталі звяртацца ва ўсе інстанцыі са скаргамі. Яны ўвогуле лічаць, што ў іх раёне варта было б зрабіць зялёную зону для адпачынку, а не будаваць катэджы.

Ала Фёдараўна даслала ў нашу рэдакцыю цэлы стос папер з адказамі. З іх вынікае, што горад сапраўды даў дазвол на выдзяленне двух зямельных участкаў пад індывідуальную забудову. Цяпер улады прызнаюць, што землеўпарадкавальная служба не выехала на месца, а аўтаматычна дала дазвол.

— Спецыялісты не паглядзелі, дзе мяркуецца пабудаваць катэджы, — патлумачыў кіраўнік Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Магілёва Яўген Лебедзеў. — Між тым, адзін зямельны ўчастак закрануў паласу дзяржаўнага ляснога фонду. Не павінна было і Любужскае лясніцтва падпісваць паперы на будаўніцтва, за што цяпер пакараныя леснікі. А таксама пазбавіўся пасады кіраўнік землеўпарадкавальнай службы.

Пасля зваротаў занепакоеных людзей раённая Адміністрацыя параіла забудоўшчыкам не пачынаць работы, бо спачатку трэба ўважліва разабрацца ў сітуацыі. Аднак на адным участку ўсё ж пачалася будоўля: там усталявалі бетонную агароджу, завезлі будаўнічыя матэрыялы. Якраз гэты зямельны ўчастак знаходзіцца побач з брацкай магілай савецкіх воінаў.

Адміністрацыя раёна звярнулася ў гарвыканкам, і ён адмяніў сваё ранейшае рашэнне аб прадастаўленні грамадзянам зямельных участкаў у раёне вуліцы Аўтазаводскай. Аднак адзін з забудоўшчыкаў звярнуўся у суд, які стаў на бок заяўніка, бо фармулёўка рашэння і падстава для яго прыняцця не адпавядалі патрабаванням заканадаўства. І, нарэшце, 3 верасня гарвыканкам паўторна разгледзеў гэтае пытанне і ўжо з правільнай фармулёўкай забраў зямельны ўчастак у забудоўшчыка і ўключыў яго ў склад зямель агульнага карыстання.

Разбор і неабходныя фармальнасці занялі некалькі месяцаў. На гэты час усе дзеянні былі замарожаныя. Навядзенне парадку стала магчыма толькі цяпер. І карэспандэнт «Звязды», якая пабывала на месцы, дзе меркавалася пабудаваць катэдж, на свае вочы ўбачыла, як тэхніка разбурае бетонную агароджу.

Нягледзячы на адказы кампетэнтных службаў пра тое, што патрабаванні жыхароў раёна вуліцы Аўтазаводскай выкананы, Ала Фёдараўна ўсё ж даслала нам ліст.

«Мы ў гэта не верым, — шчыра піша яна, — таму што нам павінны адказаць кіраўнікі выканаўчай улады. (...) Просім вас умяшацца ў вырашэнне нашага жыццёвага важнага пытання».

Аднак у органах улады нас запэўнілі, што ўмяшанне рэдакцыі не патрабуецца, таму што пытанне сапраўды вырашана, і цяпер сітуацыя ў тым раёне цалкам нармальная.

— Новым рашэннем кіраўніцтва горада пацвердзіла сваю пазіцыю: участкі пад катэджы, якія былі перададзены людзям з парушэннем закона, трэба вярнуць, — заявіў кіраўнік Адміністрацыі Кастрычніцкага раёна. — Я ўпэўнены, што супраць меркавання людзей ісці нельга. І адказна заяўляю, што ніякага будаўніцтва там не будзе. У тым месцы як была, так і застанецца зялёная зона.

Дарэчы, памкненні людзей, якія хацелі тут пабудаваць катэджы, цалкам зразумелыя: прыгожае месца, каля лесу, з вышыні бачна пойма Дняпра, далягляд шыкоўны, нібыта і непадалёк ад транспартнай магістралі — але ў цішыні, свежае паветра, спяваюць птушкі.

Таму ў гэтай зялёнай зоне ўлады мяркуюць навесці поўны парадак. Па-першае, падключыць мясцовую школу і пасадзіць дрэвы, якія незаконна высек адзін з забудоўшчыкаў, за што і быў аштрафаваны.

Месца адпачынку будзе добраўпарадкавана, запэўнілі ў Адміністрацыі раёна. Аднак гэта датычыцца не толькі вернутых зямельных участкаў, але і агародаў, гаражоў і хлявоў мясцовых жыхароў. Іх тут мноства, і будаўніцтва многіх з іх, відаць, нікім не санкцыянаванае. Металічныя гаражы радамі стаяць прама ў лесе, кавалкі зямлі з градамі агароджаныя фанерай і жалеззем, каля паўразбураных старых хлявоў валяецца смецце... Увесь гэты сумны пейзаж не вельмі падобны на зону адпачынку, ці не так? Таму ўлады плануюць сур'ёзна заняцца гэтым раёнам.

Што датычыцца забудоўшчыкаў, то яны маюць права атрымаць новыя зямельныя ўчасткі — спецыяльныя аўкцыёны праводзяцца штомесяц.

— Я упэўнены, што далей праблем не будзе, — падводзіць рысу Яўген Лебедзеў. — Мы ўлічылі, што грамадскае меркаванне адназначна супраць пабудовы катэджаў. І мы настроены ўсе пытанні вырашаць мірным шляхам.

**Падрыхтавала Ілона ІВАНОВА.**

## Пытанні ўзаемаадносінаў Беларусі і ЕС абмяркоўваюцца ў час візіту ў Мінск дэлегацыі Еўракамісіі

Дэлегацыя Еўракамісіі на чале з начальнікам аддзела Украіны, Малдовы і Беларусі генеральнага дырэктарата знешніх сувязяў ЕК Хільдэ Хардэман знаходзіцца 10—11 кастрычніка ў Мінску.

Мэта візіту — абмеркаванне шырокага кола пытанняў узаемаадносінаў паміж Беларуссю і ЕС.

Запланаваны сустрэчы дэлегацыі Еўракамісіі ў Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі і Міністэрстве замежных спраў, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе знешнепалітычнага ведамства Беларусі.




Фота БЕЛТА.

Сям'я Вольгі і Уладзіміра Іванцоў з в. Страдзічы Брэсцкага раёна са сваёй нованароджанай дачкой.

# КРЭДЫТЫ БУДУЦЬ ПАСТУПОВА ТАННЕЦЬ...

**Пасля прысваення суверэннага крэдытнага рэйтынгу Беларусі некалькі палепшыліся ўмовы атрымання банкамі нашай краіны замежных крэдытных рэсурсаў, зазначыў на ўчарашняй сустрэчы з журналістамі, на якой ішла размова аб крэдытаванні насельніцтва, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Мікалай Лузгін. Такім чынам, беларускія банкі змогуць больш актыўна прыцягваць на міжнародных рынках знешнія рэсурсы, што, у сваю чаргу, як мяркуецца, магчыма паўплывае і на кошт крэдытаў, стаўкі па якіх могуць знізіцца. Акрамя таго, плануецца, што да канца года на рынку крэдытавання пачне актыўна працаваць шэраг банкаў, у склад акцыянераў якіх увайшлі буйныя замежныя фінансава-крэдытныя ўстановы. Гэта, зразумела, толькі на руку спажыўцам: як адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення банкаўскага нагляду Нацбанка Сяргей Дубкоў, кошт крэдытаў з'яўляецца адным з сур'ёзных аргументаў для павелічэння кліенцкай базы банкаў...**

### Беларусы інвестуюць у жыллё

У сферы крэдытавання, падкрэсліў Мікалай Лузгін, найбольш аб'ёмны від дзейнасці беларускіх банкаў — крэдытаванне жыллёвага будаўніцтва. Прычым банкаўскія крэдыты з'яўляюцца асноўнай крыніцай сродкаў для ажыццяўлення жыллёвага будаўніцтва. Так, сёлета за 8 месяцаў амаль 46 працэнтаў інвестыцый у будаўніцтва жылля было здзейснена за кошт банкаўскіх крэдытаў. За гэты перыяд банкі выдалі крэдытаў на будаўніцтва і набыццё жылля на суму 1 трлн 708,3 млрд рублёў, або амаль 78 працэнтаў ад запланаванага на год аб'ёму. Што адметна — большая частка гэтых крэдытаў выдадзена на льготных умовах. Як вядома, ільготным крэдытаваннем займаюцца ААТ «ААБ Беларусбанк» і ААТ «Белаграпрамбанк»: першым за восем месяцаў было прадастаўлена 710 млрд рублёў льготных крэдытаў (гэта на 35 працэнтаў больш, чым за аналагічны леташні перыяд), другім — 558 млрд (рост на 33,6 працэнта).

Даволі актыўна, паводле слоў банкіра, выдаюцца крэдыты і на агульных падставах: за восем месяцаў іх выдадзена на суму 439,8 млрд рублёў. Між іншым, гэта больш як у два разы перавышае прагнозны паказчык на год, а ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам рост склаў 61,5 працэнта. Як мяркуюць банкаўскія спецыялісты, высокія тэмпы крэдытавання, у прыватнасці, тлумачацца хуткім ростам грашовых даходаў насельніцтва, што дазваляе людзям не проста забяспечваць мінімальныя патрэбы ў жыллі, а паляпшаць свае жыллёвыя ўмовы, жыць больш камфортна. Акрамя таго, жыллё становіца сродкам інвестыцый: цэны на камерцыйнае жыллё даволі хутка растуць, таму жыллё ў апошнія гады будаваць выгадна.

Між іншым, беларускія банкі ў адрозненне ад банкаў некаторых іншых краін, у тым ліку і Расіі, падкрэсліў Мікалай Лузгін, да заключэння крэдытных дагавораў у асноўным даюць пазычальніку інфармацыю аб поўнай працэнтнай стаўцы — з улікам усіх далейшых плацяжоў. А вось у некаторых банках за межамі нашай краіны розніца паміж першапачатковымі заяўленымі стаўкамі і поўным коштам крэдытаў бывае вельмі вялікая. Да прыкладу, там банкі не паведамляюць пра тую ж камісію за разгляд заяўкі, выдачу і д.п.

### Рост спажывецкага крэдытавання працягваецца

Хуткімі тэмпамі развіваецца і спажывецкае крэдытаванне. Калі некалькі гадоў таму, напрыклад, яшчэ ў 2003 годзе, у рэспубліцы былі мізэрныя аб'ёмы такога крэдытавання, то ў апошнія гады мы перажылі сапраўдны бум спажывецкага крэдытавання. Запазычанасць па гэтых крэдытах за шэсць гадоў — з пачатку 2001 па пачатак 2007 года — павялічылася амаль у... 200 разоў. Як лічаць спецыялісты, ужо да пачатку гэтага года рынак спажывецкага крэдытавання прайшоў першапачатковае станаўленне і насычэнне, і зараз у краіне працягваецца рост спажывецкага крэдытавання. Тэмпы росту спажывецкага крэдытавання, зазначыў Мікалай Лузгін, супастаўляльныя з тэмпамі росту крэдытавання эканомікі ў цэлым. Так, на 1 верасня патрабаванні банкаў да эканомікі ў цэлым склалі 26,2 трлн рублёў (прырост за 8 месяцаў — 26,2 працэнта), а запазычанасць па спажывецкіх крэдытах дасягнула на 1 верасня 2,9 трлн (прырост 24,89 працэнта). Прычым каля 95 працэнтаў запазычанасці па спажывецкіх крэдытах — доўгатэрміновыя крэдытныя рэсурсы, якія выдаюцца на набыццё тавараў працяглага карыстання.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### АГЕНЦТВА FITCH RATINGS ПАЦВЕРДЗІЛА РЭЙТЫНГІ ЧАТЫРОХ БЕЛАРУСКІХ ДЗЯРЖБАНКАЎ

Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Fitch Ratings пацвердзіла рэйтынгі чатырох беларускіх дзяржбанкаў — Беларусбанка, Белпрамбудбанка, Белінвестбанка і Белаграпрамбанка. Пацвярджэнне рэйтынгаў адлюстроўвае думку Fitch аб здольнасці беларускіх улад прадаставіць падтрымку гэтым банкам у выпадку неабходнасці, гаворыцца ў паведамленні агенцтва.

### «МАГІЛЁЎЛІФТМАШ» ПАЧАЎ СЕРЫЙНЫ ВЫПУСК КАТЭДЖНЫХ ЛІФТАЎ

Першая партыя ліфтаў адгружана ва Украіну. Вядуцца перагаворы аб пастаўцы катэджных ліфтаў у Расію і Азербайджан, ёсць таксама заяўкі ад беларускіх спажыўцоў. Катэджны ліфт распрацаваны спецыяльна для ўстаноўкі ў будынках з малымі пасажырапатокамі і абмежаванай прасторай. Яго грузападымальнасць складае 225 кг, а хуткасць руху — 0,63 м/с. У адрозненне ад іншых пасажырскіх ліфтаў, што выпускаюцца на заводзе, для яго не патрэбна машыннае памяшканне, за кошт чаго значна змяншаецца будаўнічая частка. Тыпавая шахта катэджнага ліфта меншая па памерах — 1,5 м на 1,5 м.

### РЭКОРДНЫ ЎРАДЖАЙ ЦЫБУЛІ

Цяпер ён складае 26,1 тыс.тон. Аб гэтым паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Гомельскай абласной асацыяцыі плодаагародніннай прадукцыі Людміла Вабішчэвіч.

Сярэдняя ўраджайнасць цыбулі ў Гомельскай вобласці складае 215 ц/га. Гадавая патрэбнасць Беларусі ў цыбулі складае 40 тыс. тон.

### ЗАТРЫМАНА ПРАДАЎШЧЫЦА, ЯКАЯ ПАДАЗРАЕЦЦА Ў ПАДПАЛЕ МАГАЗІНА

Як паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама, 19-гадовая прадаўшчыца магазіна раённага спажывецкага таварыства ў пасёлку Дружба з мэтай утойвання недастачы, што ўзнікла ў перыяд яе работы, у 5 раніцы тайна ўвайшла ў магазін, абліла бензінам сцены, дзверы і падпаліла памяшканне гэтага гандлёвага аб'екта. Пажарныя, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, змаглі хутка патушыць узгаранне. Следча-аператыўная група раённых аддзелаў міліцыі і МНС устанавіла інсцэніроўку крадзяжу, а таксама падпал памяшкання магазіна.

### БЫЛЫ ДЫРЭКТАР ЖКГ МІНСКАГА РАЁНА АСУДЖАНЫ ЗА КРАДЗЕЖ

Аб гэтым паведаміў кіраўнік прэс-службы ўпраўлення КДБ па Мінску і Мінскай вобласці Ігар Кавалеўскі.

Крымінальная справа ў адносінах да гэтага чыноўніка была ўзбуджана ў лютым гэтага года сталічным упраўленнем КДБ. У ходзе следства было ўстаноўлена, што той за кошт гаспадаркі аплачваў рамонт асабістага аўтамабіля МАЗ-5551 індывідуальнага прадпрымальніка, уступіўшы такім чынам з ім у злачынную змову.

Пакаранне было назначана ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 3 гады 6 месяцаў з канфіскацыяй маёмасці. Прадпрымальнік, які ўступіў у змову, прыгавораны да 3 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

### У МІНСКУ ЗА МІНУЛЫЯ 10 ГАДОЎ КОЛЬКАСЦЬ АБОРТАЎ ЗМЕНШЫЛАСЯ АМАЛЬ У 5 РАЗОЎ

Паведаміла начальнік аддзела лячэбна-прафілактычнай дапамогі маці і дзецям камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ірына Ушакевіч. Так, калі ў 1997 годзе гэту аперацыю рабілі 79 з 1 тыс. жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту (15—45 гадоў), то сёлета на перарыванне цяжарнасці рашыліся 16 з 1 тыс. жанчын. Калі ў 2000 годзе ў Мінску нарадзілася 15,3 тыс. дзяцей, то ў 2005-м — 16,4 тыс., а ў 2006-м — ужо 17,8 тыс. Згодна з апошнімі данымі за студзень—жнівень сёлета ў горадзе нарадзілася на 10,4 працэнта дзяцей больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

БЕЛТА.


## ТЕХНОБАНК

### Бухгалтерский баланс на 1 октября 2007 г.

Наименование банка ОАО «Технобанк»

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 | 6574,2 | 4274,1 |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 2 | 10125,4 | 5009,2 |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | | 4097,3 | 18323,1 |
| | для торговли | 11031 | 3 | 4078,3 | 18304,1 |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | 3.1 | 0,0 | 0,0 |
| | в наличии для продажи | 11033 | 3.2 | 19,0 | 19,0 |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 4 | 15216,6 | 10850,0 |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 5 | 111151,2 | 67145,5 |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | 6 | 47,9 | 47,9 |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 7 | 6343,0 | 5678,6 |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 8 | 17970,3 | 44877,5 |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | | 171525,9 | 156205,9 |
| 11 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | 9 | 0,0 | 0,0 |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 10 | 38004,7 | 25485,6 |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 11 | 73536,9 | 66439,2 |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | | 41,1 | 53,1 |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 12 | 25779,6 | 33685,7 |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 137362,3 | 125663,6 |
| 18 | **КАПИТАЛ** | | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 13 | 19985,4 | 19968,7 |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | | 0 | 0 |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | | 5249,2 | 4237,5 |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 14 | 3884,6 | 2380,3 |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | 15 | 5044,4 | 3955,8 |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | | 34163,6 | 30542,3 |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | | 171525,9 | 156205,9 |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 16 | 71737,3 | 40358,6 |
| 28 | Обязательства | 1302 | 17 | 46210,2 | 47320,0 |

### Отчет о прибыли и убытках на 1 октября 2007 г.

Наименование банка ОАО «Технобанк»

*в миллионах белорусских рублей*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2007 г. | 2006 г. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 6965,9 | 5525,1 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 5820,3 | 4036,5 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 18 | 1145,6 | 1488,6 |
| 4 | Комиссионые доходы | 2021 | | 4107,0 | 3258,7 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 763,3 | 593,5 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 19 | 3343,7 | 2665,2 |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 20 | 4350,8 | 3319,5 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 21 | -0,6 | 73,1 |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | | 0,0 | 0,1 |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 22 | 44,2 | 951,6 |
| 11 | Прочие доходы | 207 | 23 | 9376,0 | 1133,0 |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 24 | 15411,6 | 4978,6 |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 25 | 473,5 | 1508,3 |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | | 381,1 | 252,0 |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 1905,1 | 989,0 |

Руководитель В.И. Хлопицкий
И.о. главного бухгалтера С. И. Миркевич

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г.
Дата подписания 08.10.2007 г.


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПРЭЗІДЭНТ МАЛДОВЫ ПРЫЗНАЎ СВАЮ АРМІЮ «БЕСКАРЫСНАЙ»

**Уладзімір Варонін у інтэрв'ю газеце «Известия в Молдове» заявіў, што арміі Малдовы і непрызнанай рэспублікі Прыднястроўе ў цяперашнім выглядзе з'яўляюцца «абсалютна бескарыснымі».**

Як сцвярджае Варонін, яго краіна ўвогуле не збіраецца ні з кім ваяваць, таму, напрыклад, не патрэбна выдаткоўваць грошы на сучасную зброю, не трэба павялічваць колькасць вайскоўцаў. Прэзідэнт Малдовы прапанаваў уладам непрызнанай рэспублікі пераняць яго заклік і прыступіць да маштабнай дэмілітарызацыі рэгіёна. У будучыні, на думку Вароніна, Кішынёў і Цірасналь маглі б нават аб'яднаць свае ўзброеныя сілы, якія, паводле яго слоў, усё адно не стануць ваяваць адзін з адным. Варонін лічыць, што ў найбліжэйшыя гады Кішынёў і Цірасналь могуць ліквідаваць усю цяжкую тэхніку, сістэмы залпавага агню і ракетныя комплексы. У давяршэнне ён прапанаваў адмовіцца ад прызыву ў армію, а замест гэтага набіраць слухачоў на ваенна-вучэбныя курсы.

### АКРУАШВІЛІ АДМОВІЎСЯ АД СВАІХ АБВІНАВАЧАННЯЎ З-ЗА КАТАВАННЯЎ?

**Адной з версій дзіўных паводзінаў былога міністра абароны Грузіі Іраклія Акруашвілі з'яўляюцца катаванні, якімі турэмшчыкі пагражалі яго чатырохгадовай дачцэ, паведаміла газета «Твой дзень».**

Як піша выданне, падчас трансляцыі допыту Акруашвілі, яго не пазнала нават маці. Паводле слоў суразмоўцы газеты, імкнучыся абяліць прэзідэнта Саакашвілі, турэмшчыкі «папярэдне напічкалі Акруашвілі псіхатропнымі рэчывамі, у выніку чаго яго псіхіка канчаткова зламалася». На думку выдання, абсалютная большасць грузінаў лічаць, што галоўнай мэтай следства было не высветліць ісціну, а прымусіць экс-міністра адмовіцца ад сваіх абвінавачанняў у адрас Саакашвілі.

Кандыдат медыцынскіх навук, нарколаг Руслан Кардашан заявіў выданню, праглядзеўшы відэазапіс допыту Акруашвілі: «Паводзіны гэтага чалавека адпавядаюць усім прыметам другой фазы ўздзеяння псіхатропных прэпаратаў з седатыўным эфектам, якая характарызуецца зніжэннем эмацыянальнага фону. Падобныя прэпараты могуць давесці чалавека да страты розуму і дазваляюць дабіцца ад яго поўнага падпарадкавання».

### У М'ЯНМЕ АРЫШТАВАЛІ ГЕНЕРАЛАЎ І САЛДАТАЎ, ЯКІЯ АДМОВІЛІСЯ РАССТРЭЛЬВАЦЬ МАНАХАЎ



**Ваеннае кіраўніцтва М'янмы арыштавала пяцярых генералаў і 400 салдатаў, якія адмовіліся адкрыць агонь і выкарыстаць сілу супраць будысцкіх манахаў і іншых удзельнікаў антыўрадавых дэманстрацый, паведаміла інданезійская The Jakarta Post.**

Нагодай да масавых хваляванняў, якія распачаліся ў краіне яшчэ 19 жніўня, стала двухразовае павышэнне цэнаў на паліва. Паводле інфармацыі Праграмы развіцця ААН, кожны трэці жыхар М'янмы знаходзіцца за рысай беднасці, 90 працэнтаў насельніцтва жывуць на менш чым 300 долараў у год.

### АЎСТРАЛІЙСКІЯ ЎРАЧЫ ВЫЛЕЧЫЛІ ПАЦЫЕНТА СКРЫНЯЙ ГАРЭЛКІ

**Урачы з аўстралійскага горада Макей выратавалі жыццё італьянскаму турысту, які атруціўся антыфрызам, пры дапамозе скрыні гарэлкі.**

24-гадовы італьянец паступіў у бальніцу з вострым атручэннем аўтамабільнай ахаладжальнай вадкасцю, таксічныя рэчывы ў якой прыводзяць да спынення работы нырак і наступнаму смяротнаму выніку. У такіх выпадках у якасці проціяддзя выкарыстоўваецца спірт, аднак яго неабходнай колькасці ў медыкаў не аказалася. Тады было прынята рашэнне набыць скрыню звычайнай гарэлкі ў мясцовай краме. Італьянец быў змешчаны ў рэанімацыйнае аддзяленне і пры дапамозе кропельніцы кожную гадзіну яму ўводзілася тры стандартныя дозы гарэлкі. Курс лячэння працягваўся на працягу трох дзён, пацыент у гэты час знаходзіўся ў стане штучнай комы. Праз пару месяцаў турыст поўнасцю выздаравеў.


*УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона) совместно с государственным учреждением «Главное хозяйственное управление» Управления Делами Президента Республики Беларусь (продавец)*

## ПОВТОРНО ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже находящихся в республиканской собственности объектов недвижимости, расположенных в деревне Приморье Минского района:**

Лот № 1 — не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 1 (общая площадь — 438,9 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 2 (общая площадь — 557,7 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 3 (общая площадь — 568,2 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 4 (общая площадь — 523,2 кв.м); не завершенный строительством жилой дом (коттедж) № 5 (общая площадь — 429,3 кв.м); не завершенный строительством физкультурно-оздоровительный комплекс (общая площадь — 836 кв.м)

**Начальная цена лота — 1 496 100 000 белорусских рублей.**

*Площадь земельного участка — 1,27 га.*

В состав лота не входит имущество, указанное продавцом в перечне объектов, подлежащих продаже в соответствии с самостоятельным договором купли-продажи и предназначенных для обслуживания входящих в состав лота зданий. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «Белпромстройбанк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583. Договор купли-продажи между продавцом и покупателем заключается в течение 15 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение 30 календарных дней с даты подписания договора.

**Аукцион состоится 25 октября 2007 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 24 октября 2007 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 15.03.2007.

**Телефоны для справок: 227 48 36, 222 63 59, 222 48 60.**


## КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.10.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 150,00 |
| 1 еўра | 3 039,03 |
| 1 латвійскі лат | 4 312,07 |
| 1 літоўскі літ | 880,26 |
| 1 чэшская крона | 110,53 |
| 1 польскі злоты | 811,17 |
| 1 расійскі рубель | 86,05 |
| 1 украінская грыўня | 425,53 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,9842 |
| 10 UAH | 49,5227 |
| 1000 BYR | 11,6057 |
| EUR | 35,2652 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 10.10.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X

# ПАДЗАРАБІЦЬ. АЛЕ... ВЯРНУЦЦА

**Не сакрэт, што сёння міграцыйная тэма застаецца адной з самых папулярных практычна ва ўсіх краінах Еўропы. Прычым адзінага пункту гледжання тут проста няма, бо адны перакананыя, што менавіта такім чынам можна шмат у чым змякчыць па сутнасці агульную для Старога свету праблему старэння насельніцтва і дэфіцыту рабочых рук, тады як іншыя недвухсэнсоўна бачаць у мігрантах «непажаданых канкурэнтаў» на рынку працы, у адукацыі і сацыяльнай сферы. Тым часам якія суадносіны ад'ездаў і выездаў мае Беларусь, за кошт чаго можна павялічыць міграцыйны прырост і наколькі спраўдзіліся прагнозы наконт масавага выезду за мяжу беларускай моладзі? Аб гэтым і іншым — гутарка карэспандэнта «Звязды» з кандыдатам эканамічных навук, загадчыкам сектара дэмаграфічнай палітыкі Навукова-даследчага эканамічнага інстытута Мінэканомікі Наталляй Мікалаеўнай ПРЫВАЛАВАЙ.**

***— На працягу апошніх дзесяцігоддзяў статыстыка сведчыць, што Беларусь мае станоўчае міграцыйнае сальда. Якое яно зараз?***

— Сапраўды, Беларусь мае станоўчае сальда, прычым апошнім часам яно толькі павялічваецца. Калі пазалетась у краіну прыехала прыкладна на 2 тыс. чалавек больш, чым выехала за мяжу, то летась гэты паказчык склаў ужо 5,6 тысячы. Разам з тым даводзіцца канстатаваць, што пакуль агульны міграцыйны прырост атрымліваецца невялікім. Бо варта нагадаць: праграма дэмаграфічнай бяспекі вызначае за мэту станоўчае міграцыйнае сальда на ўзроўні 10 тыс. чалавек да 2010 года.

***— У такім разе дзе крыніцы для росту? І, у прыватнасці, наколькі значным «рэзервам» у дадзеным выпадку з'яўляюцца нашы суайчыннікі, колькасць якіх за мяжой, паводле розных ацэнак, вагаецца ад 2 да 3 млн чалавек?***

— Адной з вельмі важных крыніц у дадзеным выпадку з'яўляецца рэпатрыяцыя, інакш кажучы, вяртанне на радзіму этнічных беларусаў. Дарэчы, на мой погляд, нам сапраўды неабходна прыняцце закона аб суайчынніках, дзе трэба вызначыць меры па сацыяльнай адаптацыі, падтрымкі з атрыманнем жылля і работы.

Аднак не менш значны рэзерв у дадзеным выпадку — прыцягненне ў краіну высокакваліфікаваных спецыялістаў незалежна ад іх нацыянальнасці і паходжання. На жаль, у дадзеным выпадку ёсць праблемы — аналіз паказвае, што сёння большасць імігрантаў можа працаваць якраз на некваліфікаваных работах. І змяняцца гэты малюнак можа толькі паступова — прапарцыянальна росту колькасці вакансій з прывабным узроўнем аплаты працы.

Дарэчы, зноў-такі павелічэнне колькасці высокааплатных працоўных месцаў павінна змяніць і ўзроставую структуру імігрантаў. Так, даводзіцца канстатаваць, што зараз толькі чацвёртая іх частка з'яўляецца моладдзю, а 18 працэнтаў — дзецьмі і падлеткамі ва ўзросце да 16 гадоў. Такім чынам, у выніку міграцыйных працэсаў Беларусь атрымлівае тых жа дзяцей ва ўзросце да 16 гадоў амаль удвая менш, чым пенсіянераў.

***— Вопыт многіх краін Заходняй Еўропы сведчыць, што першыя хвалі мігрантаў складалі якраз людзі з не заўсёды высокім узроўнем адукацыі і прафесіяналізму. З даволі канкрэтнай прычыны — хуткага старэння «карэннага» насельніцтва і з'яўлення цяжказапаўняльных вакансій у эканоміцы. Ці магчыма паўтарэнне падобнага сцэнару ў нас?***

— Нягледзячы на паступовае старэнне насельніцтва казаць, што праблема дэфіцыту «рабочых рук» з'яўляецца для Беларусі вельмі вострай, усё ж нельга. Пэўнае скарачэнне працоўных рэсурсаў павінна адбыцца толькі сёлета, дагэтуль жа назіралася іх павелічэнне. Да таго ж было б няправільна адназначна скідваць з рахункаў магчымасці нашых пенсіянераў — многія з іх могуць плённа працаваць на айчынную эканоміку і ў 60—65 гадоў.

Таму не варта ставіцца да іміграцыі як да своеасаблівага сродку «тэрміновага латання дзірак». Тым больш што апошнія падзеі ў Францыі, Бельгіі і шэрагу іншых краін сведчаць аб тым, што да гэтага пытання трэба падыходзіць вельмі асцярожна. Заахвочванне міграцыі ў тым ліку шляхам прадастаўлення высокіх дапамог вядзе да росту ўтрыманцкіх настрояў у асяродку эмігрантаў і іншых негатыўных наступстваў. Вось чаму паралельна з эканамічнымі стымуламі нельга забывацца на культурную інтэграцыю, авалоданне мовай, павышэнне ўзроўню адукацыі і кваліфікацыі. І асабіста я не выключаю, што ў будучым нам спатрэбіцца распрацоўка новых законаў і праграм культурнай адаптацыі імігрантаў. Так, усё гэта дадатковыя грошы. Аднак адначасова не менш важна — пазбегнуць міграцыйных памылак еўрапейцаў.

***— Жыхары якіх краін аддаюць перавагу пераезду ў Беларусь? І куды звычайна накіроўваюцца беларусы?***

— Нельга не заўважыць, што рэальна «плюс» зараз дае толькі міграцыйны абмен з краінамі СНД, у першую чаргу з Расіяй, Украінай і Казахстанам. Пры гэтым, мяркуючы па ўсім, падобная тэндэнцыя захаваецца і ў будучыні.

Што да краін далёкага замежжа (галоўным чынам гаворка ідзе аб ЗША, Ізраілі і Германіі), то тут наадварот назіраецца «мінус», і як правіла, за кошт ад'ездаў мужчын. Праўда, гэты мінус пакрысе змяншаецца. Бо калі ў 2002 годзе адмоўнае сальда складала 2,8 тыс., 2005 годзе — 1,9 тыс., то летась — ужо толькі 0,6 тыс. чалавек. Такім чынам, за пяць апошніх гадоў колькасць ад'ездаў скарацілася практычна ў 4,5 раза.

***— Чым гэта можна патлумачыць?***

— Многія з тых, хто хацеў з'ехаць, да гэтага часу ўжо рэалізавалі сваё жаданне. Плюс да таго варта адзначыць, што зараз выезды ў далёкае замежжа маюць выразны сацыяльна-эканамічны характар. Прычым значная колькасць грамадзян Беларусі хочуць не толькі з'ехаць, але і вярнуцца.

***— Між тым, чаго больш у падобных памкненнях — станоўчага ці адмоўнага?***

— Калі мы кажам аб выездзе нашага насельніцтва на заробкі, то трэба мець на ўвазе не толькі паляпшэнне дабрабыту гастарбайтэраў, але і «вяртанне» значнай часткі іх грошай у Беларусь, павышэнне ўзроўню прафесіяналізму, культуры, ведаў, і ў рэшце рэшт, своеасаблівы «экспарт» інавацый. Таму ў часовых заробках нічога страшнага няма. Аднак трэба паўтарыцца: галоўнае, каб пасля гэтага нашы суайчыннікі прыязджалі назад на радзіму.

***— Варта ўзгадаць, што адно з сацыялагічных даследаванняў, якое праводзілася ў сярэдзіне 1990 гадоў, прынесла па-сапраўднаму сенсацыйныя вынікі: у той час аб жаданні выехаць за мяжу паведаміла амаль палова маладых грамадзян Беларусі ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў. Ці змяніліся падобныя настроі зараз?***

— Моладзь была і застанецца найбольш актыўнай катэгорыяй мігрантаў, менавіта на яе ў нас традыцыйна прыпадае больш за трэць ад агульнай колькасці выездаў на сталае месца жыхарства ці на работу за мяжу. Аднак апошнім часам настроі насамрэч змяніліся. Ілюзіі наконт магчымасцяў без праблем знайсці добрую работу і пачаць адразу ж зарабляць вялікія грошы ў большасці адыходзяць у мінулае. Тым больш што за апошнія дзесяць гадоў змянілася сама сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі, у выніку чаго ўсё больш маладых людзей прымаюць рашэнне «зрабіць сябе» на радзіме. І гэта добра заўважна па ўзаемадачыненнях не толькі з ЗША і Еўропай, але і Расіяй. Калі раней адбываўся масавы выезд ў гэту краіну тых жа будаўнікоў ці транспартнікаў, то зараз значная частка проста не бачыць у гэтым патрэбы. Бо перакананая: амаль такія ж грошы можна зарабіць і ў нас.

**Гутарыў Сяргей ГРЫБ.**

# КРЭДЫТЫ БУДУЦЬ ПАСТУПОВА ТАННЕЦЬ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Дарэчы, многія банкі маюць прамыя сувязі з айчыннымі вытворцамі і адпаведна на набыццё тавараў беларускай вытворчасці крэдыты выдаюцца па больш нізкіх працэнтных стаўках. Такім чынам банкі праз сістэму спажывецкага крэдытавання ў пэўнай ступені ажыццяўляюць падтрымку айчынных вытворцаў.

Як адзначыў Мікалай Лузгін, таксама хуткімі тэмпамі развіваецца і аўтакрэдытаванне. Многія банкі выдаюць крэдыты на набыццё аўтамабіляў да 90 працэнтаў ад кошту: як правіла, велічыня гэтых крэдытаў хістаецца ў межах 10—20 тысяч долараў.

## Стаўкі зніжаюцца

«У спажывецкім крэдытаванні даволі высокая ступень канцэнтрацыі гэтых крэдытаў у нашых буйных банках», — паведаміў Мікалай Лузгін. Тлумачыцца гэта тым, што больш дробныя банкі некалькі слабейшыя ў плане сваёй інфраструктуры. Таму, падкрэсліў банкір, зараз дробныя і сярэднія банкі актыўна працуюць над тым, каб ствараць цэнтры абслугоўвання фізічных асобаў, у тым ліку ў малых і сярэдніх гарадах, і развіваць гэту сферу дзейнасці. Між іншым, вядучы размову пра льготнае крэдытаванне насельніцтва, Мікалай Лузгін не выключае, што ў перспектыве магчымы ўдзел у гэтым працэсе, акрамя ААТ «АСБ Беларусбанк» і ААТ «Белаграпрамбанк», і іншых банкаў. «Неабходна паступова пераходзіць да конкурснага размяшчэння льготных крэдытаў», — зазначыў намеснік старшыні праўлення Нацбанка. Ён таксама праінфармаваў, што ў рэспубліцы паступова зніжаецца ўзровень працэнтных ставак па крэдытах у нацыянальнай валюце: з пачатку гэтага года — на 2,1 працэнта. Як мяркуюць у Нацбанку, дынаміка зніжэння працэнтных ставак захаваецца.

## Крэдыты «спаборнічаюць» са зберажэннямі

У апошні час попыт насельніцтва на крэдыты расце больш хуткімі тэмпамі, чым уклады людзей у банках, адзначыў Мікалай Лузгін. На яго думку, гэта натуральны працэс: павышаецца жыццёвы ўзровень, растуць патрэбы, і насельніцтва ўсё больш актыўна карыстаецца банкаўскім крэдытаваннем для паляпшэння сваіх жыццёвых умоў. Аднак гэта істотна мяняе ўмовы працы банкаў. Калі раней прырост зберажэнняў быў асноўнай крыніцай павелічэння рэсурснай базы банкаў, і гэтыя сродкі ішлі на крэдытаванне рэальнага сектара, то зараз практычна ўвесь прырост зберажэнняў будзе накіроўвацца на прырост крэдытавання насельніцтва. Таму, канстатаваў банкір, для захавання высокіх тэмпаў росту крэдытавання эканомікі банкам неабходна шукаць іншыя крыніцы, у тым ліку больш актыўна прыцягваць знешнія рэсурсы.

Паводле апошніх даных Нацбанка, якія агучыў Мікалай Лузгін, на 1 кастрычніка ў рэспубліцы ў абарачэнні знаходзілася каля 4,5 мільёна банкаўскіх картак, у той час як на пачатак года іх колькасць складала 3,9 мільёна. Колькасць функцыянуючых банкаматаў на гэтую ж дату — 1772. Акрамя таго, сёння 6063 прадпрыемствы гандлю і абслугоўвання прымаюць банкаўскія пластыкавыя карткі пры рэалізацыі тавараў і паслуг.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

# Беларусь сёлета імпартуе 70 тыс. тон збожжа

паведаміў карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання, дырэктар Дэпартамента па хлебапрадуктах Васіль Седзін. Раней намячалася закупіць 100 тыс. тон збожжа.

Збожжа для хлебапячэння Беларусь закупіць у Казахстане, дзе самыя прымальныя цэны на збожжа. «Нашы прадпрыемствы свядома стрымліваюць цэны на хлебабулачныя вырабы масавага спажывання ва ўрон уласнай рэнтабельнасці», — адзначыў Васіль Седзін. Каб знізіць выдаткі, у галіне распрацаваны меры па ўкараненню рэсурсазберагальных тэхналогій, устаноўцы менш энергаёмістага абсталявання. Гэта дапаможа не дапусціць рэзкага павышэння цэнаў на муку і хлебабулачныя вырабы. Калі яны і будуць павышацца, то ў межах інфляцыі.

# Цэны на пшаніцу б'юць рэкорды

Сусветныя цэны на пшаніцу за апошнія тры месяцы дасягнулі рэкордна высокага ўзроўню, што прывяло да росту цэнаў на хлеб і іншыя прадукты харчавання. Асабліва гэта адбілася на насельніцтве бедных краін. У асобных з іх элементарныя прадукты перайшлі ў разрад недасягальных для самай малазабяспечанай катэгорыі насельнікаў. У некаторых рэгіёнах гэта прывяло да сацыяльных канфліктаў.

Такая галоўная выснова ўтрымліваецца ў нядаўна выпушчаным у свет выданні Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО) «Перспектывы на ўраджай і сітуацыя з харчаваннем у свеце».

Што цікава, цэны на кукурузу таксама падскочылі нягледзячы на небывалы сёлетні яе ўраджай у краінах Паўночнай, Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі. Эксперты ФАО тлумачаць гэта стабільным і значным попытам на пшаніцу з боку вытворцаў біялагічнага паліва. Увогуле ФАО прыходзіць да сумнай высновы: у агляднай будучыні запасы збожжа, у першую чаргу пшаніцы, будуць заставацца на гістарычна нізкім узроўні. Напрыклад, цяперашнія запасы пшаніцы падышлі да самага нізкага іх узроўню за апошнія 25 гадоў.

Паводле прагнозаў ФАО, агульная сума выдаткаў на імпарт збожжа ў 2007—2008 гадах дасягне рэкорднай за ўсю гісторыю велічыні — 28 млрд долараў ЗША, ці на 14 працэнтаў больш, чым летась. Чакаецца, што бедныя і небагатыя краіны будуць вымушаны імпартаваць збожжа на 52 млрд долараў ЗША.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Утерянное свидетельство о регистрации СП «Торбел ЛТД» г. Солигорска считать недействительным.

# ВАЕННЫЯ ЗДАЛІ ЭКЗАМЕН

Ва Узброеных Сілах Беларусі завяршыўся другі этап камандна-штабных вучэнняў, у ходзе якога выконваліся задачы контрдыверсійнай і антытэрарыстычнай барацьбы. З 10 па 12 кастрычніка ўдзельнікі (у КШВ былі задзейнічаны звыш 7500 чалавек асабовага складу) вяртаюцца ў месцы пастаяннай дыслакацыі, а 850 ваеннаабавязаных запасу, якія былі спецыяльна прызваныя вучыцца абараняць сваю краіну, ужо вярнуліся на свае працоўныя месцы. Канчатковыя вынікі вучэння будуць падведзены пазней. Аднак ужо відавочна, што для часцей і падраздзяленняў, штабоў тэрытарыяльнай абароны, афіцэраў і салдат, ваеннаслужачых запасу камандна-штабное вучэнне стала сур'ёзным іспытам.

**Ірына ПРЫМАК.**

# «НІЧЫЙНЫ» ТАВАР НА 260 МЛН

Паводле даных аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама, своеасаблівы склад, дзе прыхоўваліся трыкатажныя вырабы і курткі-пухавікі, знаходзіўся ў закінутым доме ў вёсцы Віўнева Іванаўскага раёна. Тут было знойдзена і канфіскавана 34 сумкі з вырабамі агульнай вагой 1,5 тоны. Паводле папярэдніх ацэнак, кошт усяго тавару складае каля 260 мільёнаў рублёў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

# Беларусь вывучае магчымасць набыцця марскіх тэрміналаў Латвіі



**Пры гэтым мяркуецца, што ўдзел у кіраванні тэрміналамі будзе ажыццяўляцца праз стварэнне СП. Аб гэтым паведаміў міністр эканомікі Беларусі Мікалай Зайчанка ўчора на прэс-канферэнцыі ў Рызе пасля завяршэння трэцяга пасяджэння Міжурадавай беларуска-латвійскай камісіі па эканамічным і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.**

«Я не гатовы зараз сказаць, што мы будзем альбо не будзем набываць. Але гэта ўяўляе цікавасць адназначна, і мы працуем у дадзеным напрамку», — заявіў міністр.

Падчас пасяджэння камісіі бакі абмеркавалі пытанне тарыфаў на транзіт беларускіх тавараў, якія пастаўляюцца марскім шляхам у іншыя краіны праз тэрыторыю Латвіі. Паводле слоў міністра, Латвія сёння «з'яўляецца вельмі важным транспартным калідорам» для Беларусі, і «мы жадаем, каб канкурэнтаздольнасць умоў не пагаршалася» ў параўнанні, напрыклад, з Літвой.

Дзяржаўны сакратар Міністэрства эканомікі Латвіі Каспарс Герхардс заявіў, што ў найбліжэйшы час павінны прайсці сустрэчы экспертаў дзвюх краін, падчас якіх будуць абмяркоўвацца ў тым ліку пытанні тарыфаў. Пры гэтым дзяржаўны сакратар не выключыў, што можна будзе знайсці прымальныя тарыфы для Беларусі.

У Рызе таксама было падпісана пагадненне аб стварэнні СП з удзелам латвійскай кампаніі «Грындэкс» (фармацэўтыка) і Барысаўскага завода медпрэпаратаў. 51 працэнт акцый СП павінна належаць беларускаму боку, 49 — латвійскаму.

Бакі таксама дамовіліся аб пачатку мадэрнізацыі чыгуначнага пагранічнага прапускнога пункта Бігосава з тым, каб павялічыць яго прапускную здольнасць.

Мікалай Зайчанка таксама паведаміў, што падчас пасяджэння камісіі «было пастаўлена пытанне» пра выкарыстанне тэрыторыі Латвіі для дастаўкі ў Беларусь нафты з іншых краін (марскім шляхам). Паводле слоў міністра, эксперты атрымалі даручэнне «разгледзець мэтазгоднасць» выкарыстання тэрыторыі Латвіі для пастаўкі нафты.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ, г. Рыга.**

Васіль КАМЕНКА:

# «У ЛІСТАПАДЗЕ БУДЗЕ ЎВЕДЗЕНА МАРКІРОЎКА МІНЕРАЛЬНАЙ ВАДЫ І ТЭЛЕВІЗАРАЎ»

**Аб гэтым учора паведаміў журналістам намеснік міністра па падатках і зборах Беларусі Васіль Каменка, які адзначыў, што такім чынам у нашай краіне ўпершыню будзе ажыццяўляцца маркіроўка складанабытавой тэхнікі. Працэдура маркіроўкі тэлевізараў на сёння даволі складаная і патрабуе ўвядзення змяненняў у тэхналагічны працэс.**

Разам з тым мера маркіроўкі кантрольнымі знакамі ў фінансавым плане сябе цалкам апраўдвае. Да пачатку лістапада ў краіне маркіроўка будзе практыкавацца на 16 таварных групах. Мяркуецца, што ад увядзення маркіровак аб'ём падатковых плацяжоў сёлета павялічыцца амаль на 100 млрд рублёў. Намеснік міністра адзначыў, што, магчыма, у хуткім часе практыка маркіроўкі будзе распаўсюджана на імпартныя аўтамабілі і аўтазапчасткі.

## Павялічэнне ПДВ на інфляцыю не паўплывае

Вядома, што з пачатку наступнага года ў нашай краіне павялічваецца на два працэнты памер падатку на дабаўленую вартасць. Намеснік міністра адзначыў, што ў нашай краіне распрацавана заліковая схема падліку такіх падаткаў. Больш за тое, адначасова з новага года запланавана скараціць і знізіць памер ускосных падаткаў. Усё гэта ў комплексе кампенсуе павелічэнне памераў ПДВ, не прывядзе да павелічэння падатковай нагрузкі і не выкліча хвалю раскручвання інфляцыі, — запэўніў Васіль Каменка.

## Гаспадароў палацаў папросяць «падзяліцца»?

Днямі сярод жыхароў сталіцы пайшла пагалоска, што хутка ва ўсіх уладальнікаў дарагіх катэджаў будуць патрабаваць запаўняць падатковую дэкларацыю і пытацца потым, адкуль у іх на гэту маёмасць грошы. Паводле слоў начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў МПЗ Галіны Радзюкевіч, падобныя мерапрыемствы ажыццяўляліся заўсёды.

Штогод падатковыя службы патрабуюць ад жыхароў Беларусі запаўняць каля 10 тысяч дэкларацый аб даходах і маёмасці. Падатковыя арганізацыі ў гэтым выпадку супастаўляюць памеры атрыманых даходаў (па якіх плаціліся падаткі) з рэальным коштам той ці іншай маёмасці. Кантралюючыя органы міністэрства цікавяцца зараз заробкамі не толькі ўладальнікаў дарагога жылля, але і гаспадароў шыкоўных аўтамабіляў. Сёння, калі расходы грамадзян на дарагія тавары дасягаюць сумы больш за 2 тысячы базавых велічынь, то фізічная асоба павінна звяртацца ў падатковую інспекцыю з даведкай аб крыніцах грашовых сродкаў, якія накіроўваюцца на набыццё гэтага тавару. Па ўсіх відах дэкларацый, якія былі запатрабаваны ў падаткаплацельшчыкаў у выніку кантрольных мерапрыемстваў міністэрства, летась у бюджэт краіны было накіравана каля 5 млрд рублёў дадатковых плацяжоў. Толькі за 8 месяцаў сёлета па гэтаму накірунку дзяржава ўжо атрымала больш за 3 млрд рублёў.

## Кантроль за абаротам нафты

Васіль Каменка адзначыў, што ўвоз на тэрыторыю нашай краіны нафты на давальніцкіх умовах ажыццяўлялі сёлета 20 юрыдычных асобаў. Гэтымі структурамі за 9 месяцаў года было ўвезена амаль 14 мільёнаў тон нафты, што складае 95 працэнтаў да адпаведных паказчыкаў мінулага года.

Сёлета ў нашай краіне істотна павялічыўся імпарт аўтамабільнага бензіну і дызельнага паліва. Імпартам нафтапрадуктаў у Беларусі займаецца 11 юрасобаў, якімі сёлета было ўвезена 516 тысяч тон гэтай прадукцыі.

Пастудленне нафты ў нашу краіну ажыццяўлялася не заўсёды па празрыстых і законных схемах. Згодна з вынікамі кантрольнай работы ў сферы абароту нафты і нафтапрадуктаў у бюджэт краіны сёлета было даналічана каля 4,7 млрд рублёў падаткаў і эканамічных санкцый. Спецыяльнымі аперацыямі падаткавікоў у гэтым накірунку было выяўлена 223 выпадкі кантрабанды паліва непасрэдна на дарогах краіны. Пасля гэтых праверак у даход дзяржавы было канфіскавана 450 тысяч літраў нафтапрадуктаў коштам амаль на 500 млн рублёў.

Намеснік міністра адзначыў, што зараз у ценявым сектары беларускай эканомікі ствараецца каля 15 працэнтаў унутранага валавога прадукту краіны. Радуе той факт, што з кожным годам гэты адмоўны паказчык пастаянна змяншаецца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Гульня № 1**

## Замену дынамаўцу знайшлі ў «Тарпеда»

**Замест траўмаванага абаронцы мінскага «Дынама» Кірыла Паўлючака, які быў запрошаны ў нацыянальную футбольную зборную ўпершыню, у склад каманды тэрмінова выкліканы гулец жодзінскага «Тарпеда» Раман Кірэнкін. Таксама ў галоўнай футбольнай камандзе можа дэбютаваць нападаючы дубля кіеўскага «Дынама» Андрэй Варанкоў.**

Нагадаем, што зборная Беларусі рыхтуецца да адборачнага матча Еўра-2008 з Люксембургам (13 кастрычніка) і таварыскага з Ізраілем (17 кастрычніка). Да гэтых гульняў нашы футбалісты рыхтуюцца на трэніроўках у Драздах, а таксама на стадыёнах «Дарыда» і «Трактар». Капітан зборнай, паўабаронца лонданскага «Арсенала» Аляксандр Глеб трэніруецца па індывідуальнай праграме, бо не так даўно пашкодзіў нагу ў матчы англійскай прэм'ер-лігі, гуляючы супраць «Вест Хэма». У Гомель, дзе адбудзецца матч супраць Люксембурга, беларусы вылятаюць у пятніцу. Размесцяцца яны ў гасцініцы «Сож».

## Футбольныя эксперыменты

**У час чэмпіянату свету па футболе сярод клубаў у Японіі будуць праведзены два эксперыменты.**

У склад судзейскіх брыгад уводзяцца яшчэ два бакавыя арбітры. Таксама плануецца правесці выпрабаванне новых мячоў з чыпам унутры, што дазволіць дапамагчы рэферы даведацца, ці быў гол у спрэчных момантах.

## Групы ў Кубку УЕФА скамплектаваны

**У штаб-кватэры УЕФА ў швейцарскім Ньёне адбылася жараб'ёўка групавога раўнда розыгрышу Кубка УЕФА.**

Яе вынікі такія: група «А»: АЗ (Галандыя), «Зеніт» (Расія), «Эвертан» (Англія), «Нюрнберг» (Германія), «Ларыса» (Грэцыя); група «В»: «Панацінаікос» (Грэцыя), «Лакаматыў» (Расія), «Атлетыка» (Іспанія), «Капенгаген» (Данія), «Абердзін» (Шатландыя); група «С»: «Вільярэал» (Іспанія), АЕК (Грэцыя), «Фіярэнціна» (Італія), «Млада Баляслаў» (Чэхія), «Эльфсборг» (Данія); група «D»: «Базель» (Швейцарыя), «Гамбург» (Германія), «Рэн» (Францыя), «Дынама» (Харватыя), «Бран» (Нарвегія); група «Е»: «Баер» (Германія), «Спарта» (Чэхія), «Спартак» (Масква), «Тулуза» (Францыя), «Цюрых» (Швейцарыя); група «F»: «Баварыя» (Германія), «Болтан» (Англія), «Брага» (Партугалія), «Црвена Звезда» (Сербія), «Арыс» (Грэцыя); група «G»: «Андэрлехт» (Бельгія), «Тотэнхэм» (Англія), «Хетафе» (Іспанія), «Хапаэль» (Ізраіль), «Ольбарг» (Данія); група «Н»: «Бардо» (Францыя), «Аустрыя» (Аўстрыя), «Галатасарай» (Турцыя), «Паніёніс» (Грэцыя), «Хельсінборг» (Швецыя).

**Прамая лінія**

# СТАНОВІМСЯ АКТЫЎНЫМІ, ШУКАЕМ ПАЗІТЫЎ



***Усе хваробы ад нерваў. Гэты выраз, бадай, цяжка аспрэчыць. Прыгнечаны настрой, пачуццё ўласнай непаўнацэннасці, стрэсы і страхі трымаюць наша цела ў напружанні. Сутаргавы стан, узбуджанасць адразу перадаюцца на адпаведныя рэцэптары і, безумоўна, не праходзяць для арганізма бясследна.***

**Як адаб'ецца гэты дысбаланс на нашым здароўі? Які орган «адгукнецца» першым: галава — болем, страўнік — язвай, імунітэт — рэзкім падзеннем? Усё залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў, у тым ліку генетычнай схільнасці і многіх іншых аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў. Што можа прынесці палёгку, зняць напружанне? Як паводзіць сябе ў той ці іншай складанай сітуацыі, каб пазбегнуць стрэсу? Ці можна самастойна дапамагчы сабе пры дэпрэсіі? На гэтыя і іншыя пытанні падчас «прамой лініі» адказвала галоўны псіхатэрапеўт рэспублікі, кандыдат медыцынскіх навук, загадчыца кафедры псіхатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ірына БАЙКОВА.**

☎ ***— Добры дзень. Мяне завуць Сяргей Віктаравіч, званю з Мінскага раёна. Майму сыну зараз 21 год. А з 14 гадоў, пасля таго як мы перавялі яго ў гімназію ў іншы горад, пачаліся моцныя прыступы. Падчас іх ён задыхаецца, кажа, што памірае, адчувае страх. Звярталіся да раённага неўрапатолага, які паставіў дыягназ «эпілепсія». Прызначыў лячэнне. Аднак нічога не дапамагае. Прыступы працягваюцца. Што нам рабіць?***

— Дзякуй, Сяргей Віктаравіч, што вы пазванілі. Сітуацыя для мяне прыблізна ясная. Сапраўды такія праявы, на жаль, часцей за ўсё сустракаюцца пры эпілепсіі, і дыягназ, я думаю, быў пастаўлены правільна. Таму, калі зараз нешта турбуе, трэба звярнуцца зноў да неўролага ці эпілептолага, якія зараз ёсць у абласных псіхіятрычных цэнтрах. Магчыма, вашаму сыну трэба падабраць іншае лячэнне. Як правіла, трэба назірацца ў аднаго ўрача, каб ён бачыў дынаміку развіцця хваробы, бо, на жаль, стан можа пагаршацца.

***— А ці можна пракансультавацца ў вас?***

— Я кансультую ў прафесарскім цэнтры. Трэба пазваніць па тэлефоне 2193615 у рэгістратуру і запісацца на кансультацыю.

☎ ***— Тэлефаную са Жлобіна. Мяне завуць Марыя Філімонаўна, 76 гадоў. Год таму ў мяне памёр муж. Пасля гэтага ўвесь час адчуваю сябе дрэнна: галаўныя болі, выпадаюць валасы, памяці няма. Летам быццам палягчэла, а ў верасні ўсё паўтарылася зноў.***

— Звычайна такія станы пасля пахавання блізкага чалавека бываюць на працягу 1—2 месяцаў. У вас гэта цягнецца год, і ў верасні адбылося абвастрэнне. Скажыце, ці не панерваваліся вы ў гэтым месяцы з нейкай непрыемнай прычыны?

***— Былі непрыемнасці з дачкой.***

— Зразумела. Гэта і стала дадатковым стрэсам, на які вы адрэагавалі тымі парушэннямі, аб якіх гаворыце. Зараз я раю абавязкова прымаць сасудзістыя прэпараты. Дома неабходна мець корань валяр'яну, траву сардэчніку. Рабіце з іх адвары і кожны вечар прымайце перад сном па 0,5 шклянкі. Можна дзень прымаць адвар сардэчніку, дзень — мелісы.

☎ ***— Вас турбуе Ірына з Мінска. У маіх сваякоў ёсць 12-гадовы сын. Бацькі ў разводзе. І тата наведвае дзіця па выхадных. Аднак ён дакладна не вызначае час, калі прыйдзе. Хлопчык нервуецца, чакае. Толькі супакоіцца, зоймецца сваімі справамі, а тут бацька на парозе. Дзіця ўвесь час у напружанні. Як растлумачыць яму такія паводзіны дарослага?***

— Бацьку трэба растлумачыць, што дзеці ўвогуле вельмі адчувальныя да нейкіх дамоўленасцяў, асабліва ў тым выпадку, калі сын чакае візіту таты, стасункаў з ім. Дзіцяці лепей сказаць, што сустрэчы не будзе, чым паабяцаць і не прыйсці ці прымушаць чакаць няпэўна доўга. Калі хлопчык нервуецца, можна зрабіць сустрэчны званок і растлумачыць сітуацыю. Не трэба чакаць. Прэрэгатыва званка можа быць і ў маці. Нават і сам хлопчык можа пазваніць, ён жа дарослы. Гэта тая сітуацыя, калі мы вучымся аб нечым прасіць. Хачу сказаць, што многія праблемы ўзнікаюць з-за таго, што мы не ўмеем выказваць свае просьбы, баімся адмовы. Растлумачце дзіцяці прыкладна так: ты адмову атрымліваеш тады, калі не звяртаешся да таты. А калі папросіш аб сустрэчы, грошах, увазе, хутчэй за ўсё, адказ будзе станоўчым. Прывучыце дзіця да таго, што ён можа звяртацца да бацькі з просьбай, бо гэта для яго родны чалавек.

☎ ***— Тэлефаную з Маладзечна. Мяне завуць Марына. У мяне ёсць сяброўка, якая жыццё бачыць пераважна ў чорных фарбах. Вядома ж, як і ва ўсіх нас, у яе ёсць праблемы. Але ж у якасці «камізэлькі» яна выбрала мяне. Сваіх родных яна шкадуе і не турбуе скаргамі. А мне пастаянна жаліцца на адно і тое ж, аднымі і тымі ж словамі.***

— А што вы пры гэтым адчуваеце?

***— Мяне апошнім часам гэта раздражняе.***

— У такім разе трэба прама сказаць: я адчуваю раздражненне, стомленасць, калі ты пачынаеш гаварыць аб тым, аб чым мы гаварылі з табой нядаўна. Нічога ж не зменіцца ад таго, калі мы абмяркуем гэта яшчэ раз. Давай лепш пагаворым аб тым, што нас сапраўды хвалюе, аб пазітыўным, аб тым, што нас прымусіць адчуваць сябе больш камфортна, напэўна, і табе, і мне ад гэтага стане лягчэй. Калі вы скажаце ўсё гэта мяккім голасам, паверце, сяброўка не пакрыўдзіцца. Людзі рэагуюць у большай ступені на інтанацыю, чым на інфармацыю.

☎ ***— Турбуе Аксана. Званю з Рудзенска з такой праблемай. Калі мяне нехта пакрыўдзіў ці чалавек мне непрыемны, я замыкаюся ў сабе. Ці правільна гэта?***

— Не заўсёды так. Рэакцыя збегу ў сябе — тыповая, калі сітуацыя ацэньваецца вамі як напружаная ці канфліктная. Вы павінны падумаць, чаму чалавек вас пакрыўдзіў. Магчыма, ёсць нешта ў вас самой, чаго вы не можаце прызнаць у іншых людзях ці не прызнаяце ў сабе, таму і рэагуеце так эмацыянальна. Трэба паспрабаваць разабрацца: а што можа адбыцца станоўчага, калі вы наладзіце кантакт з гэтым чалавекам.

☎ ***— Чэрвеньскі раён на провадзе. Мне 47 гадоў, а адчуваю сябе на 80. Дэпрэсіўныя расстройствы пачаліся 6 гадоў таму. Лячылася ў спецыялістаў, але хвароба не праходзіць.***

— Скажыце, ці быў у вас стрэс?

***— Вельмі перажывала, калі мужу рабілі анкалагічную аперацыю. І хоць усё закончылася станоўча, лягчэй не стала. Зараз ён выпівае, пры адным яго выглядзе мне становіцца дрэнна.***

— Безумоўна, такая цяжкая сітуацыя будзе садзейнічаць зніжэнню фону настрою. Трэба, каб спецыяліст падабраў вам антыдэпрэсанты і прызначыў падтрымнае лячэнне. Я па голасу чую, што вы вельмі моцна рэагуеце на паводзіны мужа. Раю перастаць яго кантраляваць і не спрабаваць перавыхоўваць, і вам адразу стане лягчэй. Уявіце сабе, што вы надзяваеце на вочы спецыяльныя акуляры і бачыце толькі тое, што вы хочаце бачыць, а непатрэбнае проста не праходзіць скрозь шкло. Лепш, калі вы будзеце пераключаць вашу ўвагу з мужа на нейкую актыўную дзейнасць: можна праехацца на веласіпедзе, абліваццa халоднай вадой і г.д. Толькі нельга бяздзейнічаць і складваць рукі. Знаходзьце станоўчае ў сваім жыцці.

☎ ***—Добры дзень, Ірына Анатольеўна. Вам тэлефануе Уладзімір Андрэевіч з Брагіна. Мне 51 год, хварэю з 1978 года, маю другую групу інваліднасці. Як кажуць спецыялісты, у мяне паніжаная самаарганізацыя. Цяжка штосьці зрабіць, няма моцы для звычайных спраў. Па гаспадарцы, зразумела, працую, але з цяжкасцю. З раніцы нялёгка ўстаць, галава свінцовая, цяжкая, каардынацыя парушана. Да абеду крыху расхаджуся, вечарам яшчэ лягчэй, а з раніцы — тое ж самае. Як мне можна дапамагчы?***

— Ці даўно вы прымалі антыдэпрэсанты?

***— Даўно. Зараз прымаю настойку аралії па чайнай лыжцы раніцай.***

— Можна яшчэ выкарыстоўваць у якасці стымулятара лімоннік кітайскі. Мяркуючы па вашым голасе, у вас няма ярка выражанага дэпрэсіўнага стану, хутчэй, ён анэргічны. У гэтым выпадку трэба прымаць раслінныя прэпараты ў спалучэнні з вітамінными комплексамі і мікраэлементамі. Вам абавязкова патрэбны вітаміны групы В (В1, В6, В12). Ёсць добры прэпарат неарабекс — гэта спалучэнне вітамінаў групы В. У вашым стане можна прымаць па дзве таблеткі тры разы на дзень і не менш за месяц у спалучэнні з антыаксікапсам па таблетцы раніцай. Можаце дадаць пірацэтам 800 мл раніцай і вечарам.

☎ ***— Алена Мікалаеўна. Прайшло ўжо 1,5 года як памерла мая маці. І з таго часу адчуваю сябе жудасна. Вельмі моцнае сэрцабіццё. Пастаянна ўспамінаю, што ад сардэчнай хваробы памерла маці. І мне здаецца, што і ў мяне так будзе. Піла настойку глогу, валяр'яну. Нічога не дапамагае...***

— Абавязкова схадзіце да доктара, раскажыце аб сваіх сімптомах. Так часам бывае, калі ў думках, фантазіях фіксуецца стан чалавека, які памёр. І ў родных і блізкіх людзей, асабліва ў тых, хто яго вельмі моцна любіў, праяўляюцца падобныя сімптомы. Калі стан цягнецца больш чым два тыдні, трэба падумаць аб лячэнні. Магчыма вам неабходна прызначыць нешта больш моцнае, чым глог і валяр'ян, каб купіраваць сітуацыю, каб стан не заставаўся надта доўгім.

☎ ***— Званю з Мінска. Мяне завуць Ірына Мікалаеўна. Мне 44 гады. Кожную восень на працягу трох гадоў адчуваю моцны страх, бывае, суткамі не магу заснуць на працягу ночы. Стан не здымаюць заспакаяльныя прэпараты. І толькі да студзеня робіцца лягчэй. Як мне быць?***

— Ці былі тры гады назад у восеньскі час у вас непрыемнасці?

***— Так, на рабоце.***

— Хутчэй за ўсё, у падсвядомасці зафіксавалася тая сітуацыя і зараз ваш арганізм стэрэатыпна рэагуе ў той жа самы восеньскі час. Размова ідзе аб дэзарганізацыі вегетатыўнай нервовай сістэмы. Трэба накіраваць больш намаганняў на водныя працэдуры — загартоўку. Яшчэ можна выкарыстоўваць адаптагены для сну. Рэкамендуецца жэньшэнь, элеутэракок. Жэньшэнь прымаць па 15—20 кропель з невялікай колькасцю вады за паўгадзіны да яды толькі раніцай. І пачынаць трэба не тады, калі з'явіліся такія прыступы, а за месяц, для прафілактыкі — да студзеня, калі вы адчуеце стабілізацыю. Абавязкова прымаць вітаміны групы В, антыаксідантны комплекс з селенам. Чай, кава — у абмежаванай колькасці. Лепш перайсці на чай, які не ўтрымлівае кафеіну, тыпу «матэ», «ройбас», ён будзе даваць мяккую стымуляцыю. Калі не спіцца, трэба пачаць з расслабляльных ваннаў на ноч. Выкарыстоўвайце духмянае масла «Лаванда». 8—10 кропель на ванну. Яе прымаюць за 1—1,5 гадзіны да сну. Тэмпература ванны 38—40 градусаў. Магчыма, вы абыдзецеся без таблетак.

☎ ***— Званю з Нясвіжа. Вось паўгода ўжо, як мая 11-гадовая ўнучка размаўляе ў сне. Ці варта гэта лячыць?***

— Пакуль падавайце проста валяр'ян, па дзве таблеткі на ноч на працягу двух тыдняў. Але калі гэта будзе паўтарацца ці з'явяцца галаўныя болі або яшчэ нейкія сімптомы, трэба ісці да неўролага. Абавязкова трэба прымаць вітаміны.

☎ ***— Гомель на провадзе. Наш кіраўнік — працаголік. І яму здаецца, што ўсе астатнія не хочуць і не ўмеюць працаваць. Ён пастаянна абражае падначаленых, крычыць, пагражае звальненнем. У калектыве пануе вельмі нервовая абстаноўка. Як навучыцца правільна рэагаваць на такія паводзіны начальніка, каб засцерагчы сябе ад стрэсу?***

— Першае, што можна параіць, гэта перастаць лічыць такія паводзіны выключна накіраванымі на асобу падначаленага. Верагодна, ён крычыць нават не таму, што дрэнна ў калектыве, магчыма, ён проста баіцца, што будзе дрэнна ці ў яго дома ёсць праблемы. І такім чынам ён сваю агрэсію пераносіць на калектыў. Калі ж гэта толькі крык, а потым не ідуць звальненні, трэба ўспрымаць сітуацыю як форму ўзаемадзеяння.

☎ ***— Ядвіга з Мінска. Я вельмі баюся лятаць самалётамі. Ці можна пераадолець гэты псіхалагічны страх?***

— Гэта сапраўды распаўсюджаная фобія. На жаль, яна дрэнна лечыцца. Пры гэтай фобіі мы рэкамендуем перад палётам і на працягу палёту, асабліва калі ён працяглы, прымаць транквілізатары тыпу рэланіуму. Калі ў чалавека жыццё звязана з палётамі і ён ніяк не можа пераадолець страх, то прымаць пэўную дозу прэпарата трэба за дзве гадзіны да палёту і кожныя дзве гадзіны палёту. Можна паспрабаваць псіхатэрапеўтычна купіраваць гэтыя сімптомы. Такія метады таксама ёсць.

☎ ***— Алена Мікалаеўна з Оршы вас турбуе. Нядаўна ў нас здарыўся пажар, згарэў уласны дом. Зараз мы дом аднаўляем і ўжо жывём там. Аднак я баюся выходзіць са свайго жытла, мне здаецца, што калі я яго пакіну, там нешта здарыцца. Наколькі небяспечны такі стан? Ці можна з ім змагацца?***

— Вам абавязкова трэба звярнуцца да ўрача. Калі не змагацца з такім станам, ён можа быццам бы «захраснуць» і пры гэтым магчымыя ўсялякія ўскладненні.

☎ ***— Тэлефаную з Мінска. Многія слова «дэпрэсія» ўжываюць для таго, каб ахарактарызаваць свой стан, часцей за ўсё, маецца на ўвазе пры гэтым дрэнны настрой, адсутнасць цікавасці да жыцця. А якую сукупнасць сімптомаў называюць дэпрэсіяй самі ўрачы-псіхатэрапеўты?***

— Існуюць пэўныя прыметы дэпрэсіўных расстройстваў. Гэта зніжаны настрой, які не характэрны для дадзенага чалавека, страта цікавасці да ранейшых заняткаў, зніжэнне працаздольнасці, ініцыятывы. Пры гэтым такі стан цягнецца як правіла больш за два тыдні. Пры дэпрэсіі характэрнае пагаршэнне самаадчування раніцай і пэўнае паляпшэнне да абеду ці вечара. Яшчэ прымета дэпрэсіі: зніжэнне апетыту, пахудзенне больш чым на 5 кг за месяц ці набор вагі. Але апошняе — не такая тыповая прымета, як страта апетыту. Таксама пры дэпрэсіі з'яўляецца своеасаблівае парушэнне сну, якое праяўляецца ў тым, што чалавек засынае ў звычайны для яго час, а сярод ночы абуджаецца і заснуць больш не можа. У гэты час яго турбуюць нейкія трывожныя думкі, моманты, калі ён адчувае пачуццё віны, бесперспектыўнасць жыцця і г.д.

**«Прамую лінію» падрыхтавалі Святлана БАРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.**

**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

***(Працяг будзе.)***

Хто каго?

# «ШТО ЗАКЛАДЗЕНА ПРЫРОДАЙ НЕ ХАВАЙЦЕ АД НАРОДА»



**Анекдот (актуальны па сённяшнім часе) — мужчына адзін работу шукаў і ўсё безвынікова... Не, не таму, што яе не было. Была (на шчасце), але ж ён, бедны, сам з сабой паразумецца не мог: зімой — хацеў аграномам працаваць, а летам — каб настаўнікам.**

**Ці не родны брат яго ў МНС уладкаваўся, у пажарнікі?.. Таксама на долю скардзіўся. Расказваў, прынамсі, што работа ў яго, як работа. Нават добрая! Але ж як пажар, — дык хоць ты звальняйся!**

Прыкладна тое ж (калі шчыра) і ў мяне з гэтым конкурсам: многа вершаў-прапаноў — бяда, бо трэба ж іх неяк «уціснуць», меней — таксама крыўдна. Але ж... было б, калі б з чарговай поштай не прыходзілі пісьмы ў падтрымку. Кшталту: «...Гарачыя прыхільнікі роднага слова, заўзятары беларускага гумару каторы год ужо смела ідуць па дарозе конкурсу. Якасныя здымкі для яго пастаўляе ў асноўным сп. Кляшчук. Мы ж, чытачы, так бы мовіць, перапрацоўваем іх і дасылаем у рэдакцыю подпісы. Такім чынам — вытворчасць наладжана, прадукцыя, упэўнены, чытачам падабаецца. Дык хай жа гэта, наша агульная сумесная справа доўжыцца бясконца! — заклікае сп. Дубовік з в. Арэшкавічы Бярэзінскага раёна.

І, зразумела ж, прапануе свае версіі подпісаў. Ну, па-першае:

*Класік слушна нейк заўважыў,*
*Што не роўна дзеліць Бог:*
*Адным сем пудоў адважыў,*
*А другім — і тры не змог.*

Што на шчасце, відаць, бо «зараз модна ў народа хударлявая парода». А таму —

*Скінуць лішні кілаграм*
*Марыць Ева. Ды й Адам...*
*Як і ў вас зашмат фактуры, —*
*Робце аквапрацэдуры.*
*Яшчэ лепей тлушч зганяць —*
*У палонцы маржаваць.*

Вось той мужык, мусіць, і прыглядаецца, як там — ці будзе зімой палонка?

Зусім іншы ход думак у сп. Гаўрыша з в. Навасёлкі Пастаўскага раёна. «Чарговы здымак, — піша Валерый Мікалаевіч, — нагадаў мне аб сёлетніх (і летніх) рэкордных тэмпературах, аб разгубленасці сіноптыкаў, аб праблемах адпачынку. Таму і мужыка з фатаздымка не цяжка было зразумець:

*Данялі байца спякота*
*І двайны кантроль —*
*аж жах!*
*Піва б выпіць...*
*Так ахвота,*
*Ды заначка... у трусах.*

Прачытаў, працягвае аўтар, гэтыя радкі свайму хатняму крытыку — жонцы Валянціне Альбертаўне, дык тая і свой подпіс пад вечар выдала:

*Які чытач са мной*
*не пагадзіцца,—*
*У добрых мужыкоў*
*Заўжды яна бывае —*
*Заначка на піўко...*
*А можа і другая —*
*Для вабных маладзіц,*
*Што дзесь яго чакаюць...*

Чаму яны — трэба разумець, многія ды маладыя, вабныя — чакаюць яго, такога, як ёсць?.. Пра гэта (і не ў брыво...) Мікалай Старых з Гомеля:

*І кабета, і дзяўчына*
*Пазіраюць на мужчыну,*
*Бо адзіны халасцяк:*
*На бязрыб'і — шчасце й рак.*

А таму, яго, тое шчасце, берагчы трэба.

Менавіта гэтым, на думку сп. Чыгрынавай з Вілейшчыны, і займаюцца абедзве «геройкі» здымка. Прычым старэйшая якраз у гэтую хвілінку разважае:

*Нешта сцішыўся зяцёк...*
*Каб хаця куды не ўцёк?*
*...Дзвюм ім трэсціся, баяцца,*
*Толькі б з носам не застацца.*

Што яшчэ рабіць, каб гэтага не здарылася? Ну, зразумела ж, слабіны не даваць, не пускаць зяця аднаго ды абы куды. Тая ж цешча, паводле меркавання той жа Любові Міхайлаўны, свайму зяцю, напрыклад, пастаянна «пяе»:

*Без патрэбы Сантана,*
*Без патрэбы Канары.*
*Добра ж нам ля фантана,*
*Яшчэ лепей — на Шчары...*

Зрэшты, гэта зяць яе і без падказак ведае. Бо відавочна ж:

*Калі нехта сродкі мае, —*
*За мяжой адпачывае.*
*Хто ж бяднейшы,*
*скажам прама,*
*Не з багатым на Багамах.*

Гэта канстатацыя факта — ад сужэнцаў Астроўскіх з г. Мінска. Ужо ад іншага аўтара (сп. Гаўрыша з Пастаўшчыны) — заклік. Як кажуць, у тэму:

*Зямляк мой...*
*Пастаўскі ці клецкі,*
*Калі не дазволіць «карман»*
*Паехаць на бераг турэцкі,*
*Мачы сваё цела ў фантан!*

Безумоўна, ведаем мы, што няма ў беларускай мове слова «карман». Ёсць кішэня. Але ж не рыфмуецца яна з фантанам. А незамочаных целаў — шкада. І грошай таксама. Эканоміць іх трэба — на вадзе ў тым ліку. Гэта сям'я, паводле меркавання чытачоў, лічыльнікі ў кватэры паставіла і цяпер —

*Ну хіцёр сусед Раман!*
*Захапіў з сям'ёй фантан —*
*Тры тарыфы кожны дзень*
*Эканоміць на вадзе!*

Вось так. А нехта — у шапку спіць.

Ці нечым іншым заняты? Ды так, што ні аб чым больш нават думаць не можа? Цалкам магчыма.

*Хто ў Крыму, хто ля фантана...*
*Я ж — нікуды не магу,*
*Бо да сотак прывязаны,*
*Як барбос на ланцугу.*

Гэта яшчэ раз муж і жонка Астроўскія з Мінска. Не пра сябе? Не?

А наогул —

*Загарайце, раз здаровы*
*(Не вазіць жа вам вазы),*
*Малачка бы ад каровы*
*(Яшчэ лепей — ад казы)...*
*А пачне даймаць спякота, —*
*Можна і піва... У ахвоту!*

Гэта пажаданне ўсім чытачам газеты адрасуе сп. Гарбачоў з в. Сінягорская Сенненскага раёна.

І яшчэ адно. У завяршэнне гэтага агляду. Ад Міхаіла Паўлавіча Дубовіка з Бярэзіншчыны:

*Што закладзена прыродай*
*Не хавайце ад народа:*
*Ці ты стромкі, ці ты мажны, —*
*Будзь прыгожы,*
*будзь заўважны.*
*На ўсе сто — не зашпіляйся —*
*Паказаць сябе старайся...*
*Гаспадар будзь, а не госць,*
*Ганарыся тым, што ёсць!*

Гэта значыць (мы так разумеем) сабою, сваёй сямейкай, справай, горадам ці вёскай, мовай... Усім тым, чым багаты.

І без тых Багамаў...

Хоць з Багамамі, можа, і лепш было б?

Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя. Перш жа, чым паставіць кропку ў гэтай, скажам, што лепшыя подпісы да папярэдняга здымка (пра, хлопца з ліманадам, скажам так), паводле меркавання вялікага чытацкага журы, даслалі сп. Гарбачоў з Сенненшчыны, сп. Дубовік з Бярэзіншчыны, сп. Чыгрынава з Вілейшчыны, сужэнцы Астроўскія і Ала Тарасік з Мінска. Апошнюю кандыдатуру аднадушна падтрымала і журы рэдакцыйнае. Таму прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам газету на гэты раз застаецца ў сталіцы. А значыць тут, першы падпісчык на першы квартал 2008 года ў «Звязды» ўжо ёсць. Далучайцеся! Да падпісчыкаў, да ўдзельнікаў конкурсу «Хто каго?», да яго пераможцаў! Здымак, як заўжды, дадаецца — разам з пажаданнем пісаць, па магчымасці, разборліва, коратка, трапна. Колькасць прапаноў неабмежаваная, але з умовай, што ў кожнай — не больш васьмі радкоў.

Поспехаў!

**Валянціна ДОЎНАР.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



**P.S.** *У аднаго з удзельнікаў і нават пераможцаў конкурсу, ад якога вестак даўно не было, пры выпадку спыталі, чаму не піша? Адказаў, сумеўшыся, што ён — звычайны вясковец, не паэт...*

*Адкуль — заканамерная просьба да большасці аўтараў (пра асобных што-кольвечы ведаем), напішыце, хто вы, кім працуеце, як жывяце?.. Краіна ж павінна ведаць сваіх герояў, а «Звязда» — аўтараў.*

*Загадзя ўдзячныя.*

## РУП «БЕЛМЕДПРЭПАРАТЫ» АСВОІЛА ВЫПУСК ГІДРАГЕЛЕВЫХ МАТРЫЦ ДЛЯ ЛЯЧЭННЯ РАН, ЯЗВАЎ І АПЁКАЎ

**Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі на прадпрыемстве.**

У навукова-фармакалагічным цэнтры створаны 2 віды матрыц — з антыбіётыкам гентаміцынам і антысептыкам мірамісцінам, якія могуць выкарыстоўвацца ў траўматалогіі. Гэтыя прэпараты адносяцца да новага пакалення лекавых сродкаў, якія паскараюць зажыўленне. «Яны маюць шэраг пераваг перад ватна-марлевымі павязкамі. Матрыцы валодаюць высокай паглынальнай здольнасцю, таму яны не прысыхаюць да раны, чым аблягчаюць перавязку, а гідрагель можа ўбіраць у сябе ранавыя выдзяленні. Рэчывы, што ўваходзяць у склад прэпаратаў, аказваюць мясцовае процімікробнае і антысептычнае дзеянне», — расказалі на прадпрыемстве.

Вонкава матрыцы ўяўляюць сабой пласціну, якая нагадвае тонкі слой трывалага празрыстага бясколернага жэле. Яна накладваецца на пашкоджаны ўчастак скуры, добра ўтрымліваецца і лёгка здымаецца пры неабходнасці.

## ПОЛЬСКІЯ БІЗНЭСМЕНЫ ПРАПАНУЮЦЬ У ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ БУДАВАЦЬ ЯХТЫ І ВЫРАБЛЯЦЬ МЕТАЛАЧАРАПІЦУ

**Бізнэсмены з Паморскага ваяводства Рэспублікі Польшча прапануюць стварыць у Пастаўскім раёне Віцебскай вобласці сумеснае прадпрыемства па будаўніцтву лодак і яхтаў.**

Такую прапанову дэлегацыя афіцыйных і дзелавых колаў Паморскага ваяводства падрыхтавала для другой беларуска-паморскай сустрэчы, якая пройдзе ў Віцебску на V міжнародным інвестыцыйным форуме «Інвестыцыі для развіцця бізнэсу і рэгіёнаў» 11 кастрычніка. Аб гэтым карэспандэнту **БЕЛТА** паведаміў генеральны консул Беларусі ў Гданьску Руслан Есін.

Польскія бізнэсмены таксама зацікаўлены ў сумеснай рэалізацыі праектаў па вырабу металачарапіцы і перапрацоўцы мяса. Як адзначыў Руслан Есін, польскія бізнэсмены зацікаўлены ў адкрыцці вытворчасцяў у малых гарадах Беларусі.

## У БЕЛАРУСІ АДКРЫЛАСЯ ПРАДСТАЎНІЦТВА АВІЯКАМПАНІІ «ТУРЭЦКІЯ АВІЯЛІНІІ»

**Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў прадстаўніцтве, авіякампанія «Турэцкія авіяліміі» з'яўляецца вядучым нацыянальным перавозчыкам Турцыі.**

Кампанія займае 25-е месца ў свеце па колькасці паветраных суднаў у авіяпарку. У яго складзе 105 самалётаў. «Турэцкія авіяліміі» выконваюць палёты па 137 прамых маршрутах, з іх 106 — міжнародных і 31 — унутраны. У 2006 годзе авіякампаніяй перавезена 17 млн пасажыраў.

## КУЛЬТУРНЫ ЦЭНТР ДЛЯ ХВОРЫХ НА РАССЕЯНЫ СКЛЕРОЗ

**Своеасаблівы цэнтр культуры для хворых на рассеяны склероз адкрыўся ў Мінску па адрасе: вуліца Чыгуначная, 27, корп. 2, пакой 420.**

Студыя «Тэатр рускага рамансу» пад кіраўніцтвам былога педагога ўніверсітэта культуры Ірыны Фашчылінай разам з культурна-гуманітарнай установай «Залатое крэсіва», заснавальнікам якой з'яўляецца Асацыяцыя хворых на рассеяны склероз, вырашылі аб'яднаць свае намаганні на карысць яе вялікасці Творчасці. Паводле слоў старшыні праўлення Асацыяцыі хворых на рассеяны склероз Аляксея Карчэўскага, цяпер хворыя на рассеяны склероз атрымалі магчымасць навучацца спевам, танцам, ігры на гітары і многаму іншаму. Рэалізаваць свае таленты можна будзе падчас як індывідуальных і групавых заняткаў, так і выступленняў перад шырокай аўдыторыяй. З удзелам усіх ахвотных плануецца ладзіць і мастацкія выстаўкі, праводзіць творчыя сустрэчы.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Малыя гарады

## Новы завод пабудуюць у Слаўгарадзе

**Сучасны агароднінасушыльны завод, паводле планаў, павінен запрацаваць у раённым цэнтры напрыканцы 2008 года.**

Цяпер створана новае прадпрыемства «Слаўгарадскі харчавік», ідзе распрацоўка праектнай дакументацыі завода.

— Мы створым вытворчасць усіх відаў сушаных раслінных прадуктаў — бульбы і любой агародніны, а таксама садавіны, ягад і зеляніны, — паведаміў дырэктар «Слаўгарадскага харчавіка» Аляксандр Самусеў.

У Слаўгарадзе ёсць агароднінасушыльны завод, якому больш за паўстагоддзя. За ўвесь гэты час на вытворчасці не рабілі рэканструкцыю, і там сушаць бульбу, буракі і моркву па-старому — на аснове пара-паветранай тэхналогіі.

На новым прадпрыемстве будзе самая сучасная тэхналогія сушкі — выпарэння вільгаці інфрачырвоным выпраменьваннем. Гэта тэхналогія энергазберагальная, і яна дазваляе захаваць усе пажыўныя рэчывы, колер і пах. Мяркуецца, што прадукцыя знойдзе спажыўцоў на ўнутраным і знешнім (перш за ўсё — расійскім) рынках.

— Самае каштоўнае, што высушаныя паводле новай тэхналогіі прадукты можна выкарыстоўваць для страў хуткага прыгатавання, — расказала намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама Святлана Аляксеева. — Спецыялісты ездзілі на падобнае прадпрыемства ў Краснадар і прывезлі адтуль узоры прадукцыі. Ведаеце, уражвае: апускаеш у ваду, і гародніна прымае абсалютна натуральны выгляд, нібыта і не была высушаная. Наш новы завод будзе першы з падобнай тэхналогіяй у Беларусі.

Будоўля разгорнецца на тэрыторыі былой райаграпрамтэхнікі, якая не выкарыстоўваецца. Праект ацэньваецца ў 13 млрд рублёў, выдаткі акупяцца за 5—7 гадоў. Цяпер вырашаюцца пытанні фінансавання: хутчэй за ўсё, гэта будуць крэдытныя рэсурсы пад гарантыю дзяржавы.

Новы агароднінасушыльны завод у Слаўгарадзе ўваходзіць у праграму развіцця малых гарадоў. Ён, разлічваюць раённыя ўлады, у будучыні папоўніць раённы бюджэт і дасць новыя працоўныя месцы. Прыкладна 100 чалавек змогуць атрымаць працу, у тым ліку і работнікі старога завода. Аднак дырэктар «Слаўгарадскага харчавіка» адразу папярэдзіў — супрацоўнікаў будуць набіраць на конкурснай аснове.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ ДУМАЮЦЬ...

Гомельскі аблвыканкам на базе Брагінскага раёна правёў выязную сустрэчу з прадстаўнікамі прыватнага бізнэсу вобласці. Размова на ёй вялася аб тым, на якіх умовах тут могуць ажыццяўляцца бізнэс-праекты. А поле для дзейнасці прадпрымальнікаў тут сапраўды шырокае: шмат пустых памяшканняў, у раёне самая вялікая ў рэспубліцы колькасць буйной рагатай жывёлы тыпу лімузін, мяса якой патрабуе перапрацоўкі, развіваецца рыбалоўства, ёсць неабходнасць выпуску хлебабулачных вырабаў і г.д. Ці зацікавяць гэтыя і іншыя праекты прыватны капітал, пакажа час. Сустрэчы кіраўнікоў вобласці з прадпрымальнікамі ў малых гарадах будуць працягвацца і далей. Першая з іх адбылася нядаўна ў Лельчыцах (у Брагіне была другая), і некалькі дзелавых людзей ужо прапанавалі свае паслугі.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# БЕРАГЧЫ НЕ ТОЛЬКІ СЭРЦА, А І ДУШУ

**Псіхіятры ўсяго свету вымушаны канстатаваць, што псіхічнае здароўе людзей з году ў год пагаршаецца. Да 2020 года дэпрэсія выйдзе па эканамічных стратах для грамадства на другое месца, саступіўшы першую прыступку толькі ішэмічнай хваробе сэрца.**

— Яшчэ паўстагоддзя таму псіхічныя расстройствы лічыліся даволі рэдкім захворваннем, таму галоўная задача псіхіятрыі заключалася ў выяўленні людзей з псіхічнымі расстройствамі і іх ізаляцыі пераважна для таго, каб яны не перашкаджалі сваімі паводзінамі спакойна жыць іншым членам грамадства, — падзяліўся сваімі думкамі з журналістам на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **загадчык кафедры псіхіятрыі і наркалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Раман Еўсегнееў.** — Менавіта па гэтай прычыне псіхіятрычныя бальніцы выносіліся за межы гарадоў і хаваліся за высокай агароджай. Але пазней высветлілася, што псіхіятрычных хворых у грамадстве не паўпрацэнта, і нават не адзін працэнт, а нашмат болей. Больш за тое, рызыку атрымаць псіхічнае расстройства мае на працягу жыцця кожны чацвёрты чалавек. А неўратычныя расстройствы пераносіць амаль што кожны.

**АГУЛЬНАЯ КОЛЬКАСЦЬ СУІЦЫДАЎ У АБСАЛЮТНЫХ ЛІЧБАХ:**
*2003 год — 3450 выпадкаў*
*2004 год — 3298 выпадкаў*
*2005 год — 3005 выпадкаў*
*2006 год — 2825 выпадкаў*

Кожны год у Беларусі выяўляюцца і рэгіструюцца больш за 50 тысяч чалавек з упершыню ў жыцці выяўленымі псіхічнымі расстройствамі, а таксама расстройствамі паводзінаў. Наступная лічба можа напалохаць нашых чытачоў, тым не менш у дадзены момант амаль паўмільёна беларусаў маюць тыя ці іншыя псіхічныя расстройствы. І фактычна кожная чацвёртая беларуская сям'я сутыкаецца з гэтай праблемай. У дарослых дыягнастуюцца самыя розныя расстройствы: гэта і дэпрэсія, і шызафрэнія, і неўратычныя расстройствы, выкліканыя рэакцыяй на стрэс ці псіхатраўму, і расстройствы асобы, розныя формы залежнасці, напрыклад, залежнасць ад алкаголю і гэтак далей.

**СУІЦЫДАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ ГАРАДСКОГА НАСЕЛЬНІЦТВА**
*(колькасць выпадкаў на 100 тысяч жыхароў):*
**2003 г. — 26,0**
**2004 г. — 24,4**
**2005 г. — 22,4**
**2006 г. — 19,6**

— Аднак да 80 працэнтаў пацыентаў, якія трапляюць у поле зроку псіхіятрычнай службы, маюць расстройствы непсіхатычнага характару, — супакойвае галоўны пазаштатны псіхатэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Ірына Байкова. — А ад неўратычных расстройстваў церпіць ці не кожны трэці, хто звяртаецца да нас па дапамогу.

Між іншым, паводле ацэнак спецыялістаў, псіхіятрычная дапамога патрабуецца прыкладна 25 працэнтам пастаянных пацыентаў паліклінік. Гэта пацыенты з саматафорнай вегетатыўнай дысфункцыяй паталогіяй, якія звяртаюцца да тэрапеўтаў са скаргамі на болі ў сэрцы, пачашчанае сэрцабіццё, галаўныя болі, непрыемныя адчуванні ў жываце, гінекалагічны дыскамфорт, праблемы ў мочапалавой сферы і г.д. — адным словам, саматычная карціна можа быць вельмі рознай. Яны лечацца ў тэрапеўтаў тэрапеўтычнымі сродкамі, якія аказваюцца абсалютна неэфектыўнымі.

— Яшчэ 10—15 гадоў таму перш чым трапіць у псіхіятрычную службу, гэтыя людзі маглі «асаджаць» паліклініку па 7—10 гадоў, прычым абсалютна безвынікова, — тлумачыць Ірына Байкова. — Апошнім часам, на шчасце, сітуацыя стала пакрысе змяняцца. Пастулова павышаецца адукаванасць у пытаннях псіхасаматыкі і неўратычных расстройстваў спецыялістаў усіх профіляў, таму да нас пацыент трапляе недзе праз паўгода-год. Праўда, даволі часта пацыенты, якіх накіроўваюць да нас, з сумам канстатуюць: «Ад мяне адмовіліся ўрачы». У свядомасці многіх беларускіх псіхатэрапеўт быццам бы, і не ўрач. Але калі мы вылечваем такога пацыента, яго стаўленне да нас змяняецца.

Сёння беларуская псіхіятрычная служба спрабуе пераадолець негатыўныя адносіны да яе насельніцтва, якія засталіся ёй у спадчыну з савецкіх часоў, калі зварот па псіхіятрычную дапамогу цягнуў цэлы шэраг неапраўданых сацыяльных абмежаванняў, а чалавек нават з непрацяглымі нервовымі і псіхічнымі расстройствамі мог атрымаць кляймо на ўсё астатняе жыццё. Пасля прыняцця ў 1999 годзе Закона «Аб псіхіятрычнай дапамозе» прымусіць чалавека праходзіць лячэнне можна толькі праз суд. Да таго ж псіхіятрычная дапамога пачала імкліва набліжацца да насельніцтва: у многіх паліклініках сёння ўводзяцца пасады ўрачоў-псіхіятраў, адчыняюцца псіхатэрапеўтычныя кабінеты, кабінеты сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі, арганізуецца работа «гарачых» тэлефонных ліній для людзей, якія аказаліся ў складаных жыццёвых сітуацыях. Адным словам, робіцца ўсё, каб вывесці псіхіятрычную дапамогу за сцены спецыялізаваных бальнічных устаноў, зрабіць яе больш даступнай і адкрытай і павысіць да яе давер з боку насельніцтва. Ёсць яшчэ адна лічба, якая заслугоўвае ўвагі: у стацыянарах псіхіятрычную дапамогу атрымліваюць толькі 19 працэнтаў ад агульнай колькасці пацыентаў, а больш за 80 працэнтаў лечацца па-за сценамі стацыянараў, што адпавядае сусветным тэндэнцыям аказання псіхіятрычнай дапамогі ў пазабальнічных умовах з мінімальнай ізаляцыяй у стацыянары.

**СУІЦЫДАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА ПА РЭГІЁНАХ:**
*(колькасць выпадкаў у разліку на 100 тысяч жыхароў)*

| | 1997 год | 2006 год |
|---|---|---|
| г. Мінск | 19,8 | 11,5 |
| Брэсцкая вобласць | 21,8 | 25,5 |
| Віцебская вобласць | 52,0 | 40,2 |
| Гомельская вобласць | 17,2 | 28,4 |
| Гродзенская вобласць | 33,5 | 34,0 |
| Мінская вобласць | 47,6 | 36,1 |
| Магілёўская вобласць | 38,0 | 35,1 |
| увогуле па Беларусі | 33,8 | 35,1 |

Летась была зацверджана Канцэпцыя развіцця псіхіятрычнай дапамогі ў Рэспубліцы Беларусь на 2007—2010 гады, якая павінна стаць штуршком для ажыццяўлення рэформы псіхіятрычнай службы ў нашай краіне. Яшчэ адзін важны дакумент, які хутка будзе ўнесены ва ўрад, гэта праект Дзяржаўнай праграмы прафілактыкі самазабойстваў на 2008—2012 гады. На сёння Беларусь уваходзіць у пяцёрку краін з самым высокім узроўнем самазабойстваў. Штогод у Беларусі гінуць ад самазабойстваў каля 3 тысяч чалавек — больш чым у выніку дарожна-транспартных здарэнняў. Прычым гэта толькі тыя спробы, якія завяршаюцца лятальным зыходам. Але сваёй мэты дасягаюць, на шчасце, не ўсе здзейсненыя спробы. Напрыклад, жанчыны робяць у 7—8 разоў больш спроб звесці рахункі з жыццём чым мужчыны, аднак пры гэтым яны выкарыстоўваюць не вельмі «надзейныя» спосабы. Яшчэ менш завершаных суіцыдаў сярод дзяцей і падлеткаў: сярод гэтай катэгорыі насельніцтва больш распаўсюджаны дэманстратыўныя суіцыды, калі дзеці спрабуюць прыцягнуць да сябе і сваіх праблем увагу навакольных. Многіх з загінулых можна было б выратаваць, калі б ім была своечасова аказана псіхіятрычная дапамога. Напрыклад, самы нізкі па краіне ўзровень суіцыдаў — у беларускай сталіцы. Хутчэй за ўсё, гэта тлумачыцца даступнасцю для мінчан псіхатэрапеўтычнай дапамогі і наяўнасцю ў сталіцы двух тэлефонаў псіхалагічнага даверу: для дарослых і падлеткаў.

Сёлета ў краіне дзейнічаюць ужо 237 псіхіятрычных кабінетаў для абслугоўвання дарослага насельніцтва і 73 дзіцячыя псіхіятрычныя кабінеты, плюс 132 псіхатэрапеўтычныя кабінеты для дарослых і 28 псіхатэрапеўтычных кабінетаў для дзяцей. А колькасць спецыялістаў псіхіятрычнай службы дасягае 1,5 тысячы. Вось толькі грунтоўных эпідэміялагічных даследаванняў псіхічнага здароўя ў нашай краіне ніколі не праводзілася. Істотная праблема таксама — адсутнасць глыбокіх навуковых даследаванняў у галіне псіхіятрыі, наркалогіі і псіхічных расстройстваў. Магчыма, у недалёкай будучыні гэтыя прабелы будуць ліквідаваныя. Міністэрствам аховы здароўя было прынята рашэнне рэарганізаваць у 2008 годзе Рэспубліканскую псіхіятрычную бальніцу ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр псіхіятрыі і наркалогіі. На першым этапе будуць створаны дзве лабараторыі: адна будзе займацца вывучэннем алкагалічнай і наркатычнай залежнасці, а другая — праблемай самазабойстваў. У скандынаўскіх краінах, дзе раней таксама назіралася высокая суіцыдальная актыўнасць насельніцтва, спецыялістам удалося даказаць, што ўзровень суіцыдаў напрамую залежыць ад распаўсюджанасці алкагалізму. У прыватнасці, скандынавы ўстанавілі, што зніжэнне колькасці алкаголю на душу насельніцтва на адзін літр аўтаматычна зніжае ўзровень суіцыдаў на пяць адзінак. А распаўсюджанасць алкагалізму ў Беларусі захоўваецца надзвычай высокая, вось, як кажуць, і рабіце высновы...

**СУІЦЫДАЛЬНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ:**
*(колькасць выпадкаў на 100 тысяч жыхароў):*
**2003 г. — 57,0**
**2004 г. — 54,6**
**2005 г. — 52,6**
**2006 г. — 53,9**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

А на мой погляд...

## «Паленавацца творчаму чалавеку дзеля натхнення часам бывае нават карысна»

**Восень, як заўсёды, пачалася нечакана. Увесь верасень сонейка песціла нас сваім амаль што летнім цяплом, падавалася, так будзе яшчэ доўга. І вось ужо больш за тыдзень нас палівае дажджамі, месцы працы і кватэры сустракаюць няўтульнай халадэчай. Прырода, як і належыць, таксама неяк імкліва пачала рыхтавацца да зімы. Гледзячы на ўсё гэта, часам ловіш сябе на думцы, што на душы робіцца неяк халаднавата не толькі ад тэмпературы паветра... Хочацца ўхутацца ў цёплы плед, узяць у рукі добрую кнігу і — ні кроку за парог кватэры. А потым паспаць удосталь пад стук кропель дажджу за акном, не думаючы ні пра якія будзённыя клопаты і справы...**

**Ці дазваляеце вы сабе хоць бы раз-пораз ленавацца? І што асабіста вы разумееце пад словам «лянота»? Ці можа быць ад яе карысць для чалавека?**

***Андрэй КУРЭЦ, намеснік начальніка ўпраўлення паляўнічай гаспадаркі Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў»:***

— Дазваляю, вядома ж. У суботу і нядзелю часам бываю такі-і-і ля-я-я-ні-вы... Карысць? Калі выхадныя дні правёў актыўна, у панядзелак адчуваеш сябе бадзёрым, калі пасіўна — не вельмі. Так што карысць тут, скажам так, можа быць дваякай. А лянота — гэта калі ўвогуле нічога не хочацца рабіць, але даводзіцца сябе прымушаць варушыцца. Часцей, вядома ж, паленавацца атрымліваецца. Ды не, ну яго, гэты тэлевізар... Чышчу зброю, раблю патроны, але ўсё — вельмі марудна. Дарэчы, у мяне з надыходам халодных дзён такіх лянотных дзён стала значна менш. У вас наадварот? Што ж вы тады зімой будзеце рабіць?!.

***Васіль ПЯШЭВІЧ, пенсіянер, вёска Юркевічы Жыткавіцкага раёна:***

— Не ведаю, як вам і адказаць. Люблю, безумоўна, паленавацца, але ж няма калі (*смяецца*). Я ж жыву ў вёсцы, трымаю гаспадарку (дзвюх свіней, курэй, катоў), трэба, хочаш не хочаш, раніцай устаць, накарміць жывёлу. Інача́й яна хлеў «разнясе» (*смяецца*). Сам можаш галодным застацца, а жывёлу так ніколі не пакінеш. Карысць ад ляноты я бачу толькі ў адным, калі пад ёй мецць на ўвазе жаданне чалавека крыху адпачыць, збавіць рытм. А калі чалавек увогуле нічога не хоча рабіць, толькі выпіць-закусіць (*смяецца*), тады гэта да дабра не давядзе. Такія людзі вельмі хутка «апускаюцца», у хаце ў іх брудна, жывёлы няма, градак або ўвогуле няма або яны зараслі пустазеллем. Вось гэта сапраўдная лянота, а такія людзі — лайдакі.

***Хрысціна ПАЛЬЧЭЎСКАЯ, намеснік начальніка ўпраўлення рыбаводства ў натуральных вадаёмах дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадаркі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання:***

— Як я лю-ю-б-л-ю-ю ленавацца (*смяецца*)... Часам, асабліва ў суботу з раніцы... Пафланіраваць па кватэры, не спяшаючыся паліць кветкі, папіць кавы... Гэта сапраўдны, як кажуць, кайф. Не трэба нікуды бегчы, збавіць рытм будзённага дня, калі многія рэчы робяцца на паўаўтамаце. Дарэчы, па сваёй прыродзе я не зусім ляпівы чалавек, дый пра што кажу вам — не зусім лянота. Хутчэй, спосаб рэлаксацыі, які ідзе толькі на карысць. А сапраўдная лянота... Гэта калі чалавек увогуле нічога не хоча рабіць у жыцці. Прывяду прыклад, пра які нядаўна чытала ў газеце. Мужчына 38 гадоў скардзіцца, маўляў, працы няма, грошай няма і гэтак далей. Я згодна, што не кожная работа можа прынесці шмат грошай, але не паверу, што сталы мужчына ўвогуле не можа знайсці для сябе працу, няхай нават па першым часе і не вельмі высокааплатную.

***Віктар ХАРОШКА, вядучы спецыяліст Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае рэспубліканскае таварыства ратавання на водах»:***

— Часам дазваляю сабе паленавацца, асабліва ў зімовы час. Летам не да таго, бо хапае клопатаў — дача, участак і г.д. Так, у спёку таксама хочацца часам схавацца ў цяньку, але гэта не лянота. Лянота — калі лёг на канапу і ўставаць не хочацца, ёсць справы, але не робіш, адкладваеш іх на заўтра, на будучыню. А зімой і дзень кароткі, і на дачы асаблівай працы няма — зусім іншая справа. Тады і паленавацца крыху можна, прылегчы адпачыць. Хоць для справаў творчых ляноты быць не можа. Ну, скажам, прылёг ты, быццам бы і не робіш нічога. А тут нейкая думка ўзнікла, натхненне з'явілася. Ты ўскочыў і — запісваць, працаваць. Такім чынам пасіўны стан пераходзіць у творчую актыўнасць. У гэтым сэнсе творчым людзям часам і сапраўды не перашкодзіць вось так паленавацца.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

# ХЛОПЧЫК КРЫЧАЎ: «ХУТЧЭЙ БЫ ЎЖО ГЭТА КУЛЯ, А ТО МНЕ ТАК ХОЛАДНА!»

Памяць

У аператыўнай зводцы начальніка жандармерыі Брэсцкай акругі аб становішчы ў Брэст-Літоўску за кастрычнік 1942 года, якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Беларусі, сказана: «У выніку яўрэйскай акцыі колькасць жыхароў Брэст-Літоўска скарацілася з 55 тысяч да 33 тысяч чалавек». Вось так лаканічна адным радком вызначана праведзеная работа па знішчэнні людзей, а зверская расправа названа акцыяй, нібыта размова ідзе пра святочнае мерапрыемства ці рэкламную кампанію.

Гісторыя Брэсцкага гета пачалася недзе ў кастрычніку 1941 года, калі яўрэйскае насельніцтва прымусова перасялілі ў кварталы цяперашняга цэнтра горада. Гета было абнесена калючым дротам. Перамяшчацца ўнутры дазвалялася толькі да 18 гадзін. Умовы жыцця людзей у гета набліжаліся да ўмоў канцэнтрацыйнага лагера. Вязні галадалі, не было лекаў, працаздольныя людзі выкарыстоўваліся ў асноўным на цяжкіх работах, аплата за якія была мізэрнай. Мясцовым сялянам было забаронена нават прадаваць насельнікам гета якія-небудзь прадукты харчавання.

Тыя, хто працаваў у крэпасці, насілі з сабой зброю ў разабраным выглядзе, якую збіралі на месцы былых баёў. За год пастулова арганізавалася некалькі падпольных груп, якія былі нядрэнна ўзброены. Падпольшчыкі рыхтавалі аперацыю, у выніку якой людзі змаглі б вызваліцца і ратавацца хто як мог. Бо чуткі аб непазбежным знішчэнні гета станавіліся ўсё больш праўдападобнымі. На тэрыторыю гета прабралася некалькі вопытных партызанаў для наладжвання сувязі і аказання дапамогі паўстанцам. Але знайшоўся правакатар, які выдаў патрыётаў. Схапілі і партызанаў, і ўсю вярхушку падпольшчыкаў-антыфашыстаў. Было гэта восенню 42-га. Немцы сталі спяшацца. У горад прыбыў спецыяльны знішчальны атрад. Гета акружылі: праз кожныя дзесяць метраў стаялі машыны з жандарамі, праз кожныя тры машыны — танкетка. Па горадзе ішлі аблавы, палалі хутары, размешчаныя каля лесу. Горад быў ачэплены. На ўсіх дарогах і вуліцах стаялі ўзмоцненыя патрулі. Каля варот гета былі пастаўлены кулямёты і ўзмоцненая ахова. Некаторыя жыхары гета сталі хавацца ў раней прыгатаваных схованках, але амаль нікому не ўдалося выратавацца. Немцы ўрываліся ў дамы з сабакамі. Цягнулі ўсіх з падвалаў, схованаў на вуліцу, дзе і расстрэльвалі. Расстрэлы працягваліся тры дні — з 15 да 18 кастрычніка 1942 года. Тых, хто застаўся, пастроілі ў калону і пагналі ў бок крэпасці. Там пагрузілі ў таварныя вагоны і павезлі на Бронную Гару. Бронная Гара — населены пункт у Бярозаўскім раёне. Каля гэтай вёскі за тры кіламетры ад чыгуначнай станцыі фашысты давяршылі сваю чорную справу.

Здзекаваліся нават у апошнія хвіліны жыцця. Людзей прымушалі распранацца дагала яшчэ ў вагонах, а потым голых гналі да месца расстрэлу. Затым ахвяраваным на пакутную смерць загадвалі капаць ямы. У ямы складвалі радамі яшчэ жывых, а потым расстрэльвалі з аўтаматаў.

У кнізе «Памяць» (Гісторыка-дакументальная хроніка Брэста) сабраны сведчанні і былых вязняў гета, і жыхароў навакольных дамоў. Кожная з прыведзеных гісторый — жудасная трагедыя асобных сем'яў або дзесяткаў чалавек. У тыя кастрычніцкія дні вязняў расстрэльвалі і побач з гета ў цэнтры горада. Гэтак жа як і на Броннай Гары людзей падводзілі да ямы, загадвалі распранацца, расстрэльвалі і закопвалі на месцы. Сёстры Кац, якім удалося схавацца на гарышчы аднаго дома, бачылі праз акенца такі расстрэл на вуліцы Куйбышава. Маці распраналі дзяцей, а затым распраналіся самі. Восень была халодная, марасіў дождж. Адзін хлопчык закрычаў: «Мама, хутчэй бы ўжо гэта куля, а то мне так холадна!»

А былая падпольшчыца Яўгенія Корабава ўспамінае, што яе знаёмыя Даманскія, вядомыя ў горадзе ўрачы, зразумеўшы, які лёс ім наканаваны, спачатку забілі сваіх дзяцей, а затым і сябе...

Зараз на месцы, дзе пакутавалі амаль дзесяткі тысяч брастаўчан і адкуль яны накіроўваліся ў апошні шлях, стаіць помнік. Для таго, каб гэта мемарыяльная пліта з'явілася, шмат намаганняў прыклаў журналіст, нястомны збіральнік і даследчык гісторыі Аркадзь Майсеевіч Бляхер. Франтавік, чалавек-легенда. Ён правёў такую работу, сабраў столькі экспанатаў, матэрыялаў, якую хіба што пад сілу правесці цэламу музею. На фронт Аркадзь Бляхер пайшоў у 17 гадоў. Першы яго бой быў пад Сталінградам. Закончыў вайну ў Берліне. Сваё 22-годдзе сустрэў капітанам, начальнікам штаба дывізіі з чатырма баявымі ордэнамі. Пасля вайны працаваў у брэсцкіх газетах. А прыезд у горад пісьменніка Сяргея Смірнова, дзякуючы якому свет даведаўся пра гераізм абаронцаў крэпасці, стаў і штуршком для пошукаў Бляхера, якія ён не перарывае да сёння.

Малады газетчык сабраў матэрыялы пра кожнага з дзесяці Герояў Савецкага Саюза, астанкі якіх пахаваны ў Брэсце. Былі выяўлены памылкі ў прозвішчах, імёнах франтавікоў. І новая мемарыяльная дошка на помніку ў парку ўвекавечыла іх імёны правільна. У горадзе паявіліся вуліцы Карасёва, Загароднева, Скрыпнікава, Гурава не без яго, Аркадзя Майсеевіча, высілкаў. Многа зрабіў Бляхер для ўзнаўлення гістарычнай праўды пра гераізм і гібель пагранічнікаў, лёсы іх сем'яў. Заставы, як вядома, прымалі бай першымі.

Апошнія два дзесяцігоддзі Аркадзь Бляхер займаецца трагедыяй брэсцкага гета. Ён адшукаў шмат родзічаў тых, якія загінулі ў Брэсце і на Броннай Гары. У кастрычніку 1992 года гарвыканкам падтрымаў ініцыятыву Бляхера аб правядзенні дзён смутку і гуманізму. Тады ж, да 50-годдзя трагедыі быў адкрыты помнік ахвярам гета. А роўна праз пяць гадоў з ЗША і Ізраіля прыехала вялікая група нашчадкаў брастаўчан, якія загінулі ў кастрычніку 42-га. Яны накіраваліся на Бронную Гару і правялі там памінальную малітву.

Каля 15 гадоў Аркадзь Майсеевіч узначальвае брэсцкі рэгіянальны цэнтр «Халакост». Цэнтр вядзе вялікую грамадскую работу. На тэму трагедыі брэсцкага гета перыядычна праходзяць выставы ў музеях і Цэнтры маладзёжнай творчасці. Арганізуюцца конкурсы работ і вучнёўскія канферэнцыі на тэму халакоста.

Напярэдадні свайго 85-годдзя Аркадзь Майсеевіч мае шмат распачатых спраў і пошукавых праектаў. Дома ў яго — сапраўдны музей матэрыялаў пра вайну. Для яго няма нічога больш важнага, чым мінулая вайна і памяць пра яе. Асобны раздзел хатняга музея займаюць экспанаты пра Герояў Савецкага Саюза, генералаў і салдатаў вайны. Цэлая паліца назапасілася пра гісторыю косаўскага гета і гераічнае вызваленне вязняў партызанамі пад кіраўніцтвам Пранягіна. Гэта адзінае выратаванае гета ў Брэсцкай вобласці. Сабраны багаты архіў аб Праведніках свету, якімі ў вобласці прызнана 23 чалавекі.

Цяпер Аркадзь Майсеевіч працуе ў складзе камісіі па правядзенні мерапрыемстваў з нагоды 65-годдзя трагедыі гета. У Брэсце чакаюць гасцей з розных краін. Пра свой удзел у жалобнай цырымоніі заявілі прадстаўнікі дыпламатычных місій шэрагу дзяржаў. 15 кастрычніка будуць запалены свечкі каля памятных месцаў у Брэсце і на Броннай Гары.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

